

**Каб работа не стала рабствам**

СТАР. 6



**Як «Звязда» пісала гісторыю**

СТАР. 7



**Нясумны адпачынак на Радзіме**

СТАР. 21

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІПЕНЯ 2017 г. СУБОТА №144 (28508)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Сонечны час



Полацк. Дзіцячы музей. Старшы навуковы супрацоўнік Таццяна СМІРНОВА каля скульптуры «Дзяўчынка з сонечным гадзіннікам», устаноўленай у двары. Дарэчы, гэты сонечны гадзіннік — адзіны ў горадзе над Дзвіной і паказвае дакладны час.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Мы не пабаяліся, унеслі прапановы па адмене ліцэнзавання продажу алкаголю і тытунёвых вырабаў. Цяпер гэтыя прапановы разглядаюцца ў Мінэканоміцы. Гэта таксама падыходы па лібералізацыі ў сферы гандлю. Асноўная мэта — знізіць адміністрацыйныя нагрузкі на бізнес і не перашкаджаць гандлю працаваць, развівацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.07.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9396 ▼ |
| Еўра | 2,2700 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0748 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Космас — наш!

## ПЕРШАЯ ПЯЦІГОДКА

### Беларускі касмічны апарат рухае прамысловасць

**Запуск першага айчыннага спадарожніка даў штуршок развіццю шэрагу адгалінаванняў прамысловасці. Апарат мае абсталяванне беларускай вытворчасці, і дзякуючы паспяховай пяцігадовай гісторыі яго эксплуатацыі кваліфікацыя нашых распрацоўшчыкаў і якасць тэхнікі былі пацверджаны. Так, ААТ «Пеленг» ужо цяпер мае неблагі партфель заказаў на мэтавую апаратуру, таксама дадатковы імпульс атрымаў завод «Інтэграл».**



— Праект, які быў ініцыяваны ў 2003 годзе, даў моцны штуршок для развіцця новых адгалінаванняў нашай прамысловасці, — лічыць **дырэктар УП «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі Сяргей ЗАЛАТЫ.** — Фактычна, у краіне створана новае касмічнае адгалінаванне. Мы захавалі патэнцыял, які застаўся ў нас з часоў СССР, і адначасова здолелі выйсці на новы ўзровень. Важна, што створана аснова для падрыхтоўкі кадраў — у шэрагу ВНУ адкрыты спецыяльнасці па аэракасмічнай адукацыі. Больш за тое, Белдзяржуніверсітэт ужо стварыў свой наваспадарожнік, які плануецца запусціць налета.

СТАР. 3

■ Дзеля памяці

## ТРЫ ВАЙНЫ — НА АДЗІН ЛЁС

### Пра савецка-фінляндскую, Вялікую Айчынную і вайну з Японіяй Якаў Чыстабаеў гаварыць не любіў. Красамоўныя — яго ўзнагароды

**Галоўную — ордэн Чырвонай Зоркі — жыхар Бабруйска, на жаль, так і не атрымаў. Ён нават падумаць не мог, што тады, у лютым 1945-га, адным з першых пераправіўшыся на супрацьлеглы бераг ракі Пасарге (ва Усходняй Прусіі) і адбіваючы контратакі праціўніка, здзяйсняе, як сёння прынята казаць, подзвіг...**

СТАР. 4



Фота Ірыны РАБАВАЙ.

**Праўнучка і дачка Якава ЧЫСТАБАЕВА з партрэтам свайго гераічнага продка.**

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 11 дзён

**На ўсе 100!!!**

**«Звязда» запрашае вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на спартыўнае свята, якое адбудзецца сёння на спартыўнай пляцоўцы сталічнага ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

**Падрабязнасці на нашым сайце www.zviazda.by**

■ Жніво-2017

# Пачнём пазней, а збяром больш?

**У нябеснай канцылярыі, мабыць, аднагалосна прынялі рашэнне затармазіць жніво ў нашай краіне. Надвор'е шэпча... «Шэпча» спачатку лёгкім ветрам і даждżом, а потым лiўнем і спёкай. Як вынік — сёлета аграрыі пазней пасеялі збожжавыя культуры і адпаведна — пазней іх масава пажнуць. Разам з тым начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Андрэй ЗАНЕЎСКІ лічыць, што больш нізкія адносна мінулага года тэмпературы паветра пры павышанай вільготнасці не павінны аказаць адмоўнага ўплыву на асноўную масу збожжавых культур.**

Навукоўцы краіны глядзяць на ўборку ўраджаю яшчэ аптымістычней. **Генеральны дырэктар НПЦ НАН па земляробстве Фёдар ПРЫВАЛАЎ** прагназуе, што ў краіне сёлета ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур будзе больш, чым летась на 20%. Паводле папярэдніх звестак, у краіне плануецца сабраць 7,2 мільёна тон збожжавых і зернебабовых, гэта на 1,2 млн тон больш за аналагічны паказчык у мінулым годзе. Ён лічыць, што існуючыя ўмовы надвор'я спрыяльныя для збожжавых. «Наліў збожжа ў азімых культур добры. Халаднаватае і дажджлівае надвор'е для іх найбольш спрыяльнае», — растлумачыў Фёдар Прывалаў. Эксперт падкрэсліў, што для паляпшэння ўраджайнасці яшчэ можна праводзіць падкормку на пасевах яравой пшаніцы, а таксама ахову коласа ад хвароб на пасевах усіх яравых збожжавых і азімых позніх тэрмінаў сяўбы.

Аднак, што добра для каласавых, тое кукурузе ў цяжкасць. Дажджлівае і халаднаватае надвор'е адбілася на яе росце і развіцці адмоўна. Па словах навукоўца, верагоднасць добрай ураджайнасці збожжа кукурузы на поўначы краіны невысокая. «Што датычыцца збору зялёнай масы, то тэмпературны фактар практычна не мае ўплыву. Аднак якасць сіласнай сыравіны можа быць невысокай з-за павышанай вільготнасці», — лічыць Фёдар Прывалаў. Паводле яго слоў аптымізму дадае цёплае надвор'е, якое усталявалася цяпер: можна чакаць хуткага росту гэтай культуры.

У Віцебскай вобласці таксама пазітыўна глядзяць на сёлетняе надвор'е. Па словах **старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Івана ФЁДАРАВА**, вобласць сёлета разлічвае на больш высокі ўраджай збожжа — леташні паказчык могуць пераўзысці на 20—25%. Масавую ўборку збожжавых у вобласці пачнуць 5—7 жніўня.

Калі надвор'е прадказаць цяжка, то тэхнічная падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю ў нашай краіне — справа безумоўная. Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення тэхнічнага прагрэсу і энергетыкі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Станіслаў КАРПОВІЧ**, тэхнічная забяспечанасць сельгасарганізацый дазваляе правесці работы па ўборцы збожжавых у аптымальныя тэрміны. Ён падкрэсліў, што ўжо цяпер больш за 95% тэхнікі гатова да жніва.

Па стане на 26 ліпеня, у гаспадарках маецца 9555 збожжаўборачных камбайнаў. Налічваецца таксама і 2676 зернеачышчальна-сушыльных комплексаў, 92—95% з іх у спраўным стане. Для перавозкі збожжа патрабуецца больш як 12 тысяч грузавых аўтамабіляў. Для забеспячэння сельгасарганізацый запчасткамі функцыянуе інфармацыйна-пошукавая сістэма «Тэхсэрвіс». Яна дае інфармацыю аб наяўнасці запчастак на складах арганізацый аграсэрвісу і заводаў — вытворцаў сельгастэхнікі. Забяспечанасць сельгасарганізацый механізатарскімі кадрамі перад пачаткам уборкі складала 90%. Дадаткова будуць прыцягвацца больш за 2,1 тыс. камбайнераў з прамысловых прадпрыемстваў, устаноў адукацыі і з іншых работ у гаспадарках.

Па інфармацыі на 28 ліпеня, сельгасарганізацыі Беларусі намалацілі 369,6 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 30,6 ц/га. Збожжавыя і зернебабовыя культуры ўбраныя з 120,9 тысячы га, што складае 5,35% запланаваных плошчаў.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# АЦЭНКА ЗРОБЛЕНАГА КРАІНАЙ — СТАНОЎЧАЯ

## Чарговы этап перамоў па ўступленні Беларусі ў СГА пройдзе восенню

**Днямі ў Жэневе (Швейцарыя) адбылося пасяджэнне Генеральнага савета Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА), у якім у статусе назіральніка прыняла ўдзел беларуская дэлегацыя на чале з дырэктарам Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Раманам Собалевым.**

Як паведаміла прэс-служба знешнепалітычнага ведамства, у склад дэлегацыі таксама ўвайшлі прадстаўнікі МЗС і Пастаяннага прадстаўніцтва Беларусі пры Аддзяленні ААН у Жэневе.

У рамках мерапрыемства адбыліся сустрэчы з выконваючай абавязкі дырэктара Дэпартамента па далучэнні новых краін Сакратарыята СГА Майкай Ашыкава і старшынёй Рабочай групы па ўступленні Беларусі ў СГА, пастаянным прадстаўніком Турцыі ў Жэневе Кемалам Мадэнаглу.

Прадстаўнікі СГА станоўча ацанілі распаўсюджванне ў ліпені бягучага года сярод членаў Арганізацыі падрыхтаванага беларускім бокам пакета дакументаў, у тым ліку праекта Даклада Рабочай групы, што дазволіць правесці 9-е афіцыйнае пасяджэнне Рабочай групы па далучэнні Беларусі ўвосень 2017 года.

Акрамя таго, праведзены двухбаковыя кансультацыі з шэрагам членаў СГА з мэтай далейшага прасоўвання шматбаковых і двухбаковых перамоў. З прадстаўнікамі ўрада Аргенціны і Сакратарыята СГА абмеркаваны арганізацыйныя пытанні, звязаныя з удзелам беларускага боку ў 11-й сесіі Міністэрскай канферэнцыі СГА. Апошняя адбудзецца 10—13 снежня ў Буэнас-Айрэсе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пакістанскі прэм'ер сышоў у адстаўку з-за скандалу з «Панамскім архівам»

Вярхоўны суд Пакістана адхіліў ад пасады прэм'ер-міністра краіны Міяна Махамада Наваза Шарыфа ў сувязі з падазрэннем у карупцыі. Гэтае рашэнне звязана са згадваннем яго блізкіх сваякоў у так званых «Панамскіх архівах», а таксама з тым, што сям'я палітыка не змагла растлумачыць паходжанне сваіх багаццяў, паведамляе Reuters. Суд ініцыяваў расследаванне ў сувязі з публікацыяй у красавіку мінулага года дакументаў адной з панамскіх юрыдычных фірмаў. Наваз Шарыф называе абвінавачванні ў адрас сваёй сям'і палітычна матываванымі. Тым не менш пасля вынясення вердыкту ён падаў у адстаўку. Суд таксама адхіліў ад пасады міністра фінансаў Пакістана Мухамада Ісхака Дара, які лічыцца адным з найбольш уплывовых чыноўнікаў ва ўрадзе Шарыфа.

### Палата прадстаўнікоў ЗША ўхваліла вылучэнне сродкаў на праект сцяны на мяжы з Мексікай

Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША зацвердзіла павелічэнне абароннага бюджэту краіны на $68 млрд, што ўключае таксама выдзяленне сродкаў на праект будаўніцтва фізічнага бар'ера на мяжы ЗША і Мексікі. Пра гэта сведчаць вынікі галасавання, апублікаваныя на сайце Кангрэса. За дакумент прагаласавалі 235 кангрэсменаў, супраць — 192. «Цалкам задаволілі запыт прэзідэнта ЗША па будаўніцтве сцяны на паўднёвай мяжы», — напісаў у сваім Twitter спікер ніжняй палаты Пол Раян. 12 ліпеня камітэт па асігнаваннях Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША апублікаваў законапраект, які прадугледжвае выдзяленне $1,6 млрд на будаўніцтва сцяны паміж Злучанымі Штатамі і Мексікай.

### У Барселоне дзясяткі чалавек пацярпелі ў выніку аварыі пасажырскага цягніка



Паведамляецца аб 54 параненых: 19 з іх, у тым ліку машыністу, спатрэбілася аказанне медыцынскай дапамогі ў бальніцы, адзін чалавек атрымаў сур'ёзныя траўмы, але яго жыццю нічога не пагражае. Аварыя адбылася ў пятніцу раніцай на Французскім вакзале, але не паўплывала на расклад руху цягнікоў. Электрычка ўрэзалася ў адбойнік у канцы шляхоў, пад'язджаючы да платформы. Чыгуначны састаў накіроўваўся ў Барселону з правінцыі Тарагона. Па словах відавочцаў, многія пасажыры ўжо былі гатовыя да выхаду, калі цягнік пацярпеў крушэнне. Вуліцы паблізу вакзала, размешчана ў гістарычным цэнтры горада, былі перакрытыя.

### Катар заклікаў ААН дапамагчы ва ўрэгуляванні крызісу ў Персідскім заліве

Кіраўнік МЗС Катара Махамад бен Абдурахман Аль Тані заклікаў ААН дапамагчы ўрэгуляваць крызіс у Персідскім заліве, абвінавачваўшы краіны «арабскай чацвёркі» — ініцыятараў блакады Дохі — у парушэнні міжнароднага права, паведамляе тэлеканал «Аль-Джазіра». На думку міністра, Саудаўская Аравія, ААЭ, Бахрэйн і Егіпет дэманструюць упартасць і не робяць крокаў да ўрэгулявання крызісу. «Савет бяспекі, Генеральная асамблея і ўсе механізмы ААН павінны адыграць ролю ў вырашэнні канфлікту», — заявіў міністр журналістам пасля абмеркавання сітуацыі з генсекам ААН Антоніу Гутэрэшам.

■ Грошы

# БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ ЗНОЎ ВЫРАС

**З 1 жніўня гэтага года бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) у Беларусі ўстаноўлены ў памеры 197,57 беларускага рубля ў сярэднім на душу насельніцтва. Гэтыя змены будуць дзейнічаць да 31 кастрычніка.**

Па словах спецыялістаў, БПМ служыць нарматывам індэксацыі даходаў насельніцтва, выступае ў якасці крытэрыю патрэбнасці пры вызначэнні права грамадзян на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі і забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця. Акрамя таго, бюджэт пражытковага мінімуму прымяняецца для вылічэння іншых выплат і служыць крытэрыем ацэнкі пры вызначэнні права грамадзян на некаторыя віды сацыяльнай падтрымкі.

Падрабязнасці пра тое, што яшчэ і наколькі зменіцца з наступнага месяца, чытайце ў «Звяздзе» ад 1 жніўня.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Паўднёвы вектар

# НАЙПЕРШ — СУМЕСНЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

## Міністр замежных спраў назваў прыярытэты беларуска-турэцкага супрацоўніцтва

**На думку Уладзіміра Макея, гэта прамысловая кааперацыя і інвестыцыі. Аб гэтым кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі заявіў па выніках 9-га пасяджэння беларуска-турэцкай сумеснай міжурадавай эканамічнай камісіі, якое адбылося 26—27 ліпеня ў Мінску.**

— Прамой задачай нашай міжурадавай камісіі бачу пастаянны пошук новых перспектыўных праектаў у галіне гандлю, вытворчай кааперацыі, інвестыцый, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. У якасці ключавога прыярытэту, здольнага істотна павысіць узровень нашых эканамічных кантактаў, бачыцца развіццё ўзаемных інвестыцый і паглыбленне прамысловай кааперацыі, — адзначыў Уладзімір Макей.

Таксама міністр канстатаваў, што за апошнія 10 гадоў таваразварот паміж Беларуссю і Турцыяй вырас больш, чым у 5 разоў, і перавысіў 800 млн долараў па выніках 2016 года. Станоўчая дынаміка захоўваецца і сёлета. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства дадаў, што прэзідэнты абедзвюх краін паставілі задачу, каб у 2017-м таваразварот дасягнуў 1 млрд долараў.

Беларусь і Турцыя зацікаўлены ў развіцці розных формаў эканамічнага ўзаемадзеяння, уключаючы прамысловую кааперацыю, стварэнне сумесных вытворчасцяў тэхнікі, супрацоўніцтва на рынках трэціх краін. Перспектыўнымі бачацца праекты ў транспартна-лагістычнай сферы, лічыць Уладзімір Макей. «Беларусь мае ўсе ўмовы, каб стаць для турэцкіх кампаній важнай пляцоўкай па размяшчэнні лагістычных цэнтраў, вытворчых прадпрыемстваў, якія будуць арыентаваны на рынкі ЕАЭС і СНД», — дадаў міністр замежных спраў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# НОВЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ СТАРОГА АЛЬЯНСУ

**Ёсць усе магчымасці рэалізаваць задачы па дасягненні таваразвароту з Турцыяй у 1 млрд долараў, упэўнены старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч. Пра гэта ён заявіў падчас чатырнаццатага пасяджэння Беларуска-Турэцкага Дзелавога савета, які адбыўся ўчора ў Мінску.**

Уладзімір Улаховіч падкрэсліў, што для нашай краіны вельмі важна, каб тры беларускія машынабудаўнічыя флагманы адкрылі зборачныя вытворчасці ў Турцыі. «Гэтае пытанне ўжо прапрацоўваецца. Гаворка ідзе пра «Гомсельмаш», Мінскі аўтамабільны завод, «Амкадор». Чакаем, што і прадукцыя «БелАЗа» вернецца на турэцкі рынак», — сказаў ён.

Прамысловая кааперацыя — далёка не ўсё, што мы можам прапанаваць. «Мы павінны знайсці магчымасці для больш глыбокай перапрацоўкі агародніны і садавіны, якая пастаўляецца з Турцыі, для экспарту гэтай прадукцыі з дабаўленай вартасцю з Беларусі на новыя рынкі», — падкрэсліў старшыня БелГПП. Акрамя таго, Турцыя — вядомы вытворца мэблі, а сыравіны для яе вытворчасці ў гэтай краіне недастаткова. Беларусь з мадэрнізаванай дрэваапрацоўчай прамысловасцю можа прапанаваць супрацоўніцтва і ў гэтым кірунку. У дзвюх дзяржаў таксама адкрываюцца магчымасці для кааперацыі ў сферы транспартных паслуг, лагістыкі.

Адным з найбольш важных кірункаў узаемадзеяння Уладзімір Улаховіч назваў навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. «За 2016 год патрэбы рынку высокіх тэхналогій у Турцыі выраслі ў некалькі разоў. У той жа час краіна знізіла сілу ўзаемадзеяння ў гэтым кірунку з еўрапейскімі партнёрамі. У беларускай інавацыйнай прадукцыі ёсць добрыя перспектывы, улічваючы, што ў турэцкага боку ёсць магчымасць інвеставаць у развіццё сумесных распрацовак», — рэзюмаваў ён.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# «Хацела завяршыць усё прыгожа»

## Аляксандра Герасіменя заваявала бронзавы медаль чэмпіянату свету

**Гэта першая ўзнагарода беларусаў на сусветным першынстве па плаванні ў Венгрыі. У фінальным заплыве на дыстанцыі 50 м на спіне Герасіменя, паўтарыўшы рэкорд Еўропы, фінішавала трэцяй з вынікам 27,23 секунды. «Золата» ў гэтай дысцыпліне ў бразільянкі Эцьен Медэйрас (27,14 сек.), «серабро» ўзяла кітайская спартсменка Юань Хуэй Фу (27,15 сек.).**



*— Шмат хто казаў: што ж табе не жывецца спакойна пасля Алімпіяды! Але я адчувала, што порах яшчэ застаўся, тым больш на гэтай дыстанцыі сябе не да канца рэалізавала. Хацела паспрабаваць гэта зрабіць, тым больш, што на Алімпійскіх гульнях дыстанцыі 50 м на спіне няма. Хацела завяршыць усё прыгожа, медаль чэмпіянату свету — гэта ндярнна, але заўсёды складана сказаць, ці з'яўляецца гэты турнір для цябе апошнім,* — адзначыла Аляксандра. — *З аднаго боку, я хацела б заняцца сям'ёй і асабістым жыццём, як і казала раней, з другога — можна сумясціць гэта з кар'ерай. Калі буду адчуваць, што сілы ёсць, змагу працягнуць. Калі адчую, што неканкурэнтаздольная, то не буду мучыць сябе.*

Цяперашні бронзавы медаль — трэцяя ўзнагарода чэмпіянатаў свету для Аляксандры Герасімені. Раней у 2007 годзе ў Мельбурне яна заваявала «серабро» на 50 м на спіне, у 2011 годзе ў Шанхаі выйграла «золата» на 100 м вольным стылем. На Алімпіядах спартсменка тройчы ўздымалася на п'едэстал — у яе актыве два сярэбраныя медалі Лондана-2012 (100 м і 50 м вольным стылем), а таксама «бронза» Рыа-дэ-Жанейра-2016 (50 м вольным стылем).

Спаборніцтвы ў Будапешце будуць доўжыцца да 30 ліпеня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

# «Золата» з Бразіліі

**Гамяльчанін Ягор Дубовік узяў найвышэйшую прыступку на 58-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Рыа-дэ-Жанэйра. Усяго беларускія школьнікі ў далёкай краіне заваявалі шэсць медалёў.**

«Серабро» — ў мінчаніна Аляксея Васілеўскага, а бронзавыя медалі атрымалі чатыры навучэнцы ліцэя БДУ. У агульнакамандным заліку ў беларусаў 14 месца. 615 чалавек са 111 краін спаборнічалі сёлета ў штогадовым чэмпіянаце свету па матэматыцы, які праводзіцца з 1959 года сярод школьнікаў старшых класаў.

Выпускнік гомельскай гімназіі №51 Ягор Дубовік трэці раз выступаў за беларускую зборную. Пазалетась і летась ён атрымліваў «бронзу». Гэта алімпіяда для юнака стала самай паспяховай. Дарэчы, малады чалавек ужо паступіў у БДУ на прыкладную матэматыку. Ён прайшоў па-за конкурсам дзякуючы сваім мінулым дасягненням.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

■

# ПЕРШАЯ ПЯЦІГОДКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па сцвярджэнні спецыяліста, касмічнае адгалінаванне заўсёды было «рухавіком» народнай гаспадаркі — многія інавацыі першапачаткова з'яўляліся менавіта ў гэтай сферы. Захаванне гэтай тэндэнцыі для Беларусі вельмі важнае. Калі ацаніць сумарна эканамічныя дывідэнды ад работы БКА (продаж інфармацыі і тэхналогій, тыражаванне мэтавай апаратуры і іншае), то бюджэтныя затраты на стварэнне і эксплуатацыю беларускай касмічнай сістэмы не толькі акупіліся, але і прынеслі немалы прыбытак.

— Хочацца адзначыць, што ўсе пяць гадоў апарат працаваў беспрабойна, тое самае можна сказаць і пра наземную інфраструктуру, — падкрэсліў Сяргей Залаты. — БКА зняў больш за 120 мільёнаў квадратных кіламетраў зямной паверхні. Пры гэтым тэрыторыя Беларусі пакрыта шматразова. Уся інфармацыя для дзяржаўных органаў кіравання перадаецца бясплатна, камерцыйныя спажыўцы яе могуць купіць.

Вядома, што ўжо вядзецца работа над новым Беларускім касмічным апаратам. Гэта будзе прынцыпова новая прылада з больш высокім разрозненнем здымкаў і аднačасова вельмі кампактная. Так, амерыканскія аналагі маюць вагу прыкладна ў 2,5 тоны, наш — каля 950 кг. Беларускіх элементаў у БКА-2 будзе каля 30 працэнтаў — гэта ўся карысная нагрузка апарата. Паводле слоў **кіраўніка апарата НАН Пятра ВІЦЯЗЯ,** запусціць спадарожнік плануецца ў 2020 ці 2021 годзе. Тэхнічныя параметры апарата ўжо ўзгоднены, цяпер стаіць пытанне адкрыцця фінансавання.

— Па нашых папярэдніх разліках, БКА-2 будзе каштаваць каля 180 мільёнаў долараў, — сказаў спецыяліст. — Сюды ўваходзяць усе расходы, уключаючы страхоўку і запуск. Беларускі «Пеленг» ужо пачаў распрацоўку мэтавай апаратуры для новага спадарожніка за ўласныя сродкі. З расійскага боку карпарацыя «УНДІЭМ» таксама за ўласныя сродкі распрацоўвае платформу. Фінансавацца праект будзе як іншыя сумесная навуковыя праграмы Саюзнай дзяржавы: трэць грошай выдзеліць Беларусь, астатняе — Расія.

— Два нашы касмічныя апараты, якія працуюць у сумеснай групоўцы, адпрацавалі свой гарантыйны тэрмін — пяць гадоў, — адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара Дзяржкарпарацыі «Раскосмас» па аўтаматычных касмічных апаратах і комплексах Міхаіл ХАЙЛОЎ.** — Што самае прыемнае, яны працягваюць работу і будуць надалей пастаўляць інфармацыю на карысць абедзвюх дзяржаў. Не хачу рабіць ні пазітыўных, ні негатыўных прагнозаў, але, мяркуючы па існуючым досведзе, такія апараты часам працуюць і на працягу трох гарантыйных тэрмінаў. З увядзеннем у эксплуатацыю нашых спадарожнікаў мы набылі поўную імпартанезалежнасць па оптаэлектроннай апаратуры. Раней прыходзілася звяртацца да замежных касмічных апаратаў і плаціць дастаткова сур'ёзныя грошы, каб атрымліваць даныя. Падагульняючы, супрацоўніцтва з беларускімі калегамі ацэньваем дастаткова высока. Будучая работа па стварэнні новага пакалення спадарожнікаў стане вялікім крокам наперад. Яны будуць мець больш высокае разрозненне, змогуць працаваць у новых спектральных каналах — усё гэта дазволіць істотна пашырыць магчымасці спадарожнікавай здымкі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by

■ Аты-баты

# ПЕРШЫНСТВО НАЙМАЦНЕЙШЫХ

## Сёння пад Масквой пачынаюцца «Армейскія міжнародныя гульні — 2017»

**Вось ужо трэці год запар вайскоўцы з розных краін свету збіраюцца прадэманстраваць магчымасці нацыянальных армій. Па колькасці ўдзельнікаў, а гэта каля дзвюх тысяч чалавек, сёлетнія гульні стануць пакуль самымі маштабнымі ў гісторыі. Гонар сваіх Узброеных Сіл на працягу двух тыдняў будуць адстойваць і беларускія ваеннаслужачыя.**

За гады існавання вайсковай алімпіяды, як называюць армейскія гульні, беларускія вайскоўцы паказвалі добрыя вынікі. Летась наша каманда была чацвёртай. Але саступіць дзвюм наймацнейшым арміям свету — Расіі і Кітаю, а таксама Казахстану, прадстаўнікі якога ўдзельнічалі практычна ва ўсіх конкурсных выпрабаваннях, — гэта пройгрышам назваць складана. Тым больш, што ў выніковым рэйтынгу за беларусамі значыліся ваеннаслужачыя з 15 армій свету.

Сёлета на палігонах Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кітая і Расіі будуць спаборнічаць танкісты, лётчыкі, дэсантнікі, артылерысты, сапёры, снайперы, кінолагі, кухары і іншыя армейскія спецыялісты з 28 краін свету — такой колькасці ўдзельнікаў у гісторыі гульняў яшчэ не было! Прадстаўнікі яшчэ сямі дзяржаў накіраваны ў якасці назіральнікаў.

З 28 конкурсных спаборніцтваў, сярод якіх пяць новых, зборная Узброеных Сіл Беларусі возьме ўдзел у палове з іх. Больш — толькі ў камандаў з Расіі, Кітая і Казахстана.

Традыцыйна самым маштабным спаборніцтвам гульняў стане «Танкавы біятлон», у якім прыме ўдзел 55 экіпажаў з 19 дзяржаў. Беларускія экіпажы прадстаўляюць вайскоўцы 6-й, 11-й і 120-й асобных гвардзейскіх механізаваных брыгад, а таксама 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў — усяго чатыры экіпажы, адзін з якіх запасны. Нашы танкісты сёлета ўдзельнічаюць у гонцы на мадэрнізаваных танках, якія нядаўна паступілі на ўзбраенне беларускай арміі. Спадзяёмся, гэта ім дапаможа прынесці ў скарбонку нашай каманды перамогу. Поспехаў, вайскоўцы!

**Вераніка КАНЮТА.** kanyuta@zviazda.by

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ВАДА ПАМЫЛАК НЕ ДАРУЕ

**За гэты тыдзень вада адабрала 8 жыццяў, сярод іх — два дзіцяці. Абодва выпадкі адбыліся ў чацвер. У Смаргоні 11-гадовы хлопчык у адзіночку адпачываў на вадзе, а ў якасці плыта абраў кавалак пенапласту. У нейкі момант школьнік з яго саслізнуў і пайшоў на дно.**

А ў Пінску 14-гадовы падлетак патануў у ліўневай канаве. Па ёй выраішылі прайсці два браты. Раптам адзін з іх праваліўся ў яму, якую вымылі моцныя дажджы. Малодшы брат пабег клікаць на дапамогу. Мясцовы жыхар знайшоў цела хлопчыка на глыбіні каля двух метраў. Вратаваць яго не ўдалося.

Ёсць усе падставы меркаваць, што сітуацыя на рэках і азёрах Беларусі ўскладніцца. На краіну насоўваецца хваля спякоты. Ртутны слупок будзе штурмаваць адзнаку ў 30 градусаў па Цэльсіі. І ахаладзіцца да вады пойдуць тысячы людзей.

— Мы просім не адпускаць дзяцей на вадаём адных, — кажа **вядучы спецыяліст рэспубліканскага савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Як правіла, трагедыі на вадзе з хлопчыкамі і дзяўчынкамі здараюцца з-за бацькоўскага недагляду. Самім жа дарослым варта ўстрымацца ад моцных напояў, купацца толькі ў дазволеных для гэтага месцах і не выкарыстоўваць самаробныя плавальныя сродкі. Непасрэдна ў спякоту мы рэкамендуем купацца не больш за 5—10 хвілін, паколькі розбежка паміж тэмпературай вады і паветра можа дасягаць 10 і нават больш градусаў. З-за гэтага ўзнікае рызыка цеплавога ўдару.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** schklennik@zviazda.by

## ЗАПАЛАНІЛІ ЖАНІХА

**Нядаўна ў адной з паўднёвых краін грамадзяніна Беларусі ўзялі ў палон з-за... нежадання ажаніцца з мясцовай дзяўчынай. Інфармацыя аб гэтым размешчана на старонцы Міністэрства замежных спраў нашай краіны ў Facebook.**

23 ліпеня беларуская дыпмісія ў адной са спякотных краін атрымала інфармацыю аб тым, што грамадзянін Рэспублікі Беларусь узяты ў заложнікі ўзброенымі родзічамі мясцовай дзяўчыны, ажаніцца з якой ён адмовіўся. Пры дапамозе sms-паведамлення беларус змог скрытна паведаміць дыпмісіі дакладны адрас, план памяшкання, колькасць узброеных людзей і іх размяшчэнне ў будынку. У выніку спецаперацыі мясцовай паліцыі грамадзянін нашай краіны быў вызвалены і вярнуўся на радзіму.

У Міністэрстве раяць больш уважліва адносіцца да рэкамендацый ведамства аб паводзінах падчас выезду за мяжу і быць асцярожнымі з абяцаннямі ажаніцца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by

## ЛЕС УСІХ ЗАБЛЫТАЎ

**Чарговых ахвяр цікага палявання на гэты раз шукалі ў бабруйскіх лясах.**

Разгубленая жанчына патэлефанавала на пульт аператыўнага ўпраўлення Бабруйскага гаррайаддзела па НС а палове чацвёртай гадзіны вечара. Яна паведаміла, што пабач з ёй яшчэ адна жанчына і яны заблукалі ў лесе дзесьці паміж вёскамі Ламы і Вішнёўка.

— Пошукі жанчын доўжыліся каля 2 гадзін, — падзяліўся падрабязнасцямі **начальнік караула пажарнай аварыйна-выратавальнай часці №3 Мікалай КАСТРАМА.** — Мы абследавалі квадрат за квадратам лясного масіву, перыядычна ўключаючы гукавую сірэну. Увесь гэты час пастаянна падтрымлівалі сувязь з пацярпелымі і інструктавалі, што рабіць. А калі знайшлі, то аказалася, што жанчын не дзве, а тры. Трэцяя выпадкова выйшла на сябровак па няшчасцю, калі блукала па лесе. І ў яе нават не было тэлефона.

Улічваючы, што грыбны і ягадны сезон у разгары, ратавальнікі раяць узяць на ўзбраенне некалькі карысных парад. Калі вы заблукалі ў лесе, прыслухайцеся: шум трактара чуваць за 3—4 кіламетры, брэх сабакі — за 2—3, цягніка — за 10 кіламетраў. Трымайце курс на гук. Паспрабуйце знайсці якую-небудзь сцежку або лясную дарогу і ідзіце па ёй. Паклапаціцеся, каб тыя, хто вас будуць шукаць, не прайшлі міма — пакіньце на кустах кепку, насоўку, ліст паперы, на крайні выпадак, зламайце галінку. Абавязкова пазваніце па тэлефоне 101 або 112.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

## ЗНОЙДЗЕНЫ МЁРТВЫМ ГЕНЕРАЛЬНЫ ДЫРЭКТАР «КІНАВІДЭАПРАКАТА»

**Генеральны дырэктар УП «Кінавідэапракат» Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Юрый Чачукевіч быў знойдзены мёртвым у двары дома на праспекце Дзяржынскага, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка Следчага камітэта Беларусі Юлію Ганчарову.**

Упраўленне СК па Мінску праводзіць праверку па факце гібелі мужчыны. Паведамляецца, што цела са слядамі падзення з вышыні знайшлі каля пад'езда аднаго з жылых дамоў. Цяпер праводзіцца агляд месца здарэння з удзелам супрацоўнікаў ГУУС і ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Мінску. Асоба загінулага ўстаноўлена.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by

# ТРЫ ВАЙНЫ — НА АДЗІН ЛЁС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выконваць пастаўленую задачу, абараняючы таварышаў, хоць і цаной уласнага жыцця, — справа сапраўднага салдата. Якаву Чыстабаеву ў тым баі на шляху да Берліна нават пашанцавала: ён быў толькі паранены. Відаць, з-за гэтага своечасова і не атрымаў заслужаную ўзнагароду. Радавы Перамогі нават не ведаў аб яе існаванні.

Затым былі пасляваенныя клопаты — не да ўзнагарод. Амаль усе мужчыны, якіх пашкадавала вайна, вярнуліся дамоў героямі. Але не прынята неяк было выхваляцца. Ордэны і медалі хавалі куды далей, каб яшчэ адзін напамін аб тым жудасным, што давялося перажыць, не трывожыў душу.

Цяпер інакш. Ветэраны адзін за адным сыходзяць у іншы свет. І так хочацца, каб яны расказалі яшчэ што-небудзь пра вайну — тое, чаго не знойдзеш ні ў адным падручніку па гісторыі, чаго не паведаміць нават самы дасведчаны навуковец. Вось і імкнецца сённяшняя моладзь распытаць гэтых пасівелых дзядкоў ды бабуль, пакуль яшчэ не позна. Калі ж час страчаны, ідуць у архівы, а цяпер — і на спецыяльныя інтэрнэт-рэсурсы, каб даведацца, кім іх продак быў на вайне, за што атрымаў узнагароды, якія, як самая каштоўная рэліквія, захоўваюцца ў сем'ях.

## УЗНАГАРОДУ АДШУКАЛА ПРАЎНУЧКА

Дар'я, праўнучка Якава Чыстабаева, з аповедаў бабулі ведала, што яе прадзед прайшоў фінскую вайну, абараняў сваю Радзіму на франтах Вялікай Айчыннай, ваяваў з японцамі на Далёкім Усходзе. Але ніхто ў сям'і не змог адказаць, за што канкрэтна атрымаў узнагароды, якія пры жыцці ўпрыгожвалі прадзедаў кіцель. Як ні дзіўна, дапамог інтэрнэт.

— Вельмі хацелася даведацца, за які подзвіг быў уручаны той жа медаль «За адвагу», — расказвае праўнучка ветэрана. — Дзякуючы электроннаму банку дакументаў «Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне» высветлілася, што Якаў Пятровіч першы ўварваўся ў траншэю да ворага і са свайго аўтамата забіў восем нямецкіх салдат і афіцэраў.

Знайшла дзяўчына апісанні подзвігаў і на іншыя прадзедавы ўзнагароды. Нават на тую, што, як аказалася, сярод сямейных рэчаў ніколі не было. Нічога не ведала пра ордэн Чырвонай Зоркі і бабуля, дачка франтавіка.

— Бацька мала расказваў пра вайну, — прызнаецца Клаўдзія Якаўлеўна. — Усе тады ваявалі. На фронце былі і два яго браты. Прайшлі ўсю вайну. Вярнуліся. Не хацелі нічога пра сябе расказваць: сціплыя былі. Пра прысвоены, але не ўручаны ордэн, мы ніколі не чулі.

Каб даведацца ісціну, Клаўдзія Чыстабаева вырашыла звярнуцца ў мясцовы ваенкамат. Завязалася перапіска з Цэнтральным архівам Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Аказалася, што сапраўды, ордэн Чырвонай Зоркі яе бацьку прысвоілі, але з невядомых прычын уручаны ён так не быў.

На днях гэтую памылку выправілі. Падчас урачыстай цырымоніі ў ваенным камісарыяце горада Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў нашчадкі Якава Чыстабаева атрымалі пасведчанне аб узнагароджванні. Сам ордэн захоўваецца ў архіве — такія правілы сённяшняга часу.

## ЗНАЙСЦІ І ЎВЕКАВЕЧЫЦЬ

За апошнія тры гады ваенным камісарыятам горада Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў было знойдзена і перададзена ветэранам, а таксама іх сваякам больш як дзесяць узнагарод самага рознага статусу. Тройчы, прычым за дастаткова кароткі перыяд, давялося засведчыць гэтыя важныя падзеі для кожнай з сем'яў у журналісцкі блакнот.

— Нядаўна ўпраўленнем па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл у ваенкамат былі перададзены 17 імянных медальёнаў разам з астанкамі, знойдзеных апошнім часам пры пошукавых работах на тэрыторыі Бабруйшчыны, — расказвае **вядучы спецыяліст па сацыяльнай абароне і пенсійным забеспячэнні ваеннага камісарыята Вольга БАКІЦЬКО.** — Астанкі вайскоўцаў Другой сусветнай ужо перапахаваны. Засталося адшукаць сваякоў загінулых воінаў: гэтыя ўкладышы павінны захоўвацца ў сем'ях.

Пытанне ўвекавечвання памяці абаронцаў Айчыны з'яўляецца адным з прыярытэтных у рабоце ваеннага камісарыята Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў. Па словах **ваеннага камісара палкоўніка Аляксея БЕРАЗОЎСКАГА**, гэтаму спрыяе сама гісторыя мясцовасці. «Роўна тры гады Бабруйскі раён быў пад акупацыяй, нямала бабруйчан пайшло на фронт, — гаворыць ваенны камісар. — На тэрыторыі раёна сёння актыўна вядуцца пошукавыя работы, ды і нашчадкі пераможцаў сталі больш цікавіцца гісторыяй сваёй сям'і. Мы ім толькі дапамагаем аднавіць гэтыя «белыя плямы».

Дарэчы, у Аляксея Беразоўскага яшчэ жывы дзед-ветэран. Анатоль Мікалаевіч Сотнікаў, якому сёння 95 гадоў, прайшоў усю вайну. Пачынаў гэты небяспечны шлях кіроўцам на Ладазе, змагаўся на палях Сталінграда, браў Кёнігсберг, вайну скончыў у Чэхаславакіі. Працягваў насіць пагоны і ў мірны час. Цікава, што прадзед ваеннага камісара служыў у царскай арміі, бацька сышоў у запас у званні падпалкоўніка.

Ёсць кім ганарыцца і Вользе Бакіцько. Штогод на Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці ў яе дзядулі, Льва Абрамавіча Кацмана, збіраецца ўся сям'я. Удзельнік Вялікай Айчыннай, маёр запасу ўжо праўнукам расказвае, як кавалася Перамога ў тыле.

Такім чынам, супрацоўнікі ваеннага камісарыята добра ведаюць, што значыць для нашчадкаў знайсці свайго гераічнага продка альбо даведацца нешта новае пра яго лёс. Калі ў апошніх гаць вочы ад сустрэчы (хоць часам і не фізічнай) альбо ад таго, што дакранаюцца да невядомых дагэтуль эпізодаў з гісторыі сваёй сям'і, значыць яны робяць сваю справу недарэмна.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

*г. Бабруйск.*

■ Спадчына

# КЛЁН НА ПАДПОРКАХ

## Як ратуюць стагадовыя дрэвы ў парку пад Лідай

**Парк «Горні» каля Ліды быў закладзены 135 гадоў таму і лічыцца помнікам прыроды мясцовага значэння. Да гэтай пары тут захавалася амаль 400 дрэў, чый узрост перайшоў стагадовы рубеж альбо набліжаецца да яго. Разам з тым у парку з'яўляецца ўсё больш пянькоў.**



Каб захаваць старыя дрэвы, тут скарысталіся сучаснымі тэхналогіямі. Па-першае, апрацавалі ствалы спецыяльнымі растворамі. Ад пламбіроўкі трухлявых частак адмовіліся, бо гэта шкодзіць дрэву, кажуць спецыялісты. Замест гэтага ствалы замацавалі металічнымі дубцамі з некалькіх бакоў. Такіх дрэў на падпорках тут некалькі. Яны — равеснікі старога парку, які закладвалі па ініцыятыве царскай дзяржаўнай ляснойахоўы на пачатку 80-х гадоў XIX стагоддзя. З тае пары дайшлі ліпавыя алеі, асобныя насаджэнні лістоўніцы сібірскай, сасны веймутава і звычайнай, дуба і ясеня. Дзесьці 160 дрэў маюць біяграфію працягласцю сто гадоў і больш.



Цукрысты клён — самы старажытны насельнік парку. Ён яшчэ і самы магутны. Яго вышыня складае больш за 30 метраў, а дыяметр амаль 4 метры. Дрэва гатова было развваліцца, адпала вялікая галіна, але дзякуючы прынятым мерам клён працягвае свой век і не засыхае. Магчыма, гэтаму спрые скульптура лясного духа ў выглядзе доўгабародага дзядулі. Як расказаў **намеснік дырэктара Лідскага лясгаса Чэслаў БАРКО,** скульптуру лясного ахоўніка стварыў мясцовы майстар Іван Мікулка. Сваю фантазію скульптар накіраваў і на стары пень. На ім уладкавана «вуха жадання».

— Гэта вуха не церпіць мітусні і шуму, — тлумачыць Чэслаў Міхайлавіч, — да яго трэба падысці і шапнуць сваё жаданне, але зрабіць гэта ціха, каб ніхто не чуў, і яно споўніцца. Турысты правяралі.

Лясныя прывіды з'явіліся тут нядаўна, як і падпоркі на дрэвах. Выратаванне старога парку праведзена ў рамках маштабнага праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да зялёнай эканомікі», які фінансуецца ЕС і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Праект толькі што завяршыўся, і яго галоўным вынікам стала стварэнне на тэрыторыі парку Экалагічнага адукацыйнага цэнтра. Гэта сапраўдны рай для батанікаў. Бо можна не толькі прачытаць аб рэдкіх раслінах, але і ўбачыць іх. Расце тут клён Гінала, вязы, грабы, чырвоны дуб, павіслая бяроза, рабінія лжэакацыя, белая таполя — усяго 41 від дрэў і кустарнікаў. Ёсць незвычайныя экзэмпляры. Чэслаў Барко абавязкова раскажа сваю версію аб цесна сплеценых чарэшчатым дубе і ліпе, кроны якіх губляюцца недзе ўгары. На яго думку, дрэвы спляліся, каб разам свой век дажываць і адно аднаго падпіраць.

Партнёры лясгаса — «Беларускае батанічнае таварыства» разам з Інстытутам эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі — пастаянна даследуюць парк, які мае навуковае, гістарычнае і экалагічнае значэнне. Яны і даюць рэкамендацыі па яго ўтрыманні. Напрыклад, сцяжынкі тут натуральныя, толькі прысыпаныя драўнянымі шчэпкамі. Травяністыя расліны скошваюць толькі раз у канцы лета, каб захаваць прыродную разнастайнасць. Лічыцца, што парк павінны быць больш лясным, чым гарадскім.

Гэта і вабіць сюды жыхароў Ліды. А для дзяцей уладкавана свая пляцоўка і маршрут па Алеі казак. На тэрыторыі парку «Горні» ёсць турыстычны комплекс, дзе можна застацца на некалькі дзён. Цяпер тут усталёўваюць музей мёду, бо ёсць і свая пасека.

Нядаўна ў парку з'явілася новая алея, якая вядзе да воінскага абеліска. Помнік Невядомаму салдату стаіць з 60-х гадоў. Месца расчысцілі, старыя бярозы спілавалі, пасадзілі новыя.

У парк наведваюцца і шлюбныя пары. Для іх пабудавана альтанка. У сезон яны садзяць тут сваё Сямейнае дрэва. У будучыні плануецца стварыць кустарнікавы лабірынт, паставіць альтанкі, драўляныя скульптуры. Пакуль работа па захаванні ўнікальнага дэндрапарку толькі пачалася, зазначыў Чэслаў Барко. Але добра, што на гэта звернута ўвага, бо такіх унікальных месцаў у нас не так многа. І хто ведае, можа дрэва, замацаванае падпоркамі, прастаіць яшчэ гадоў сто...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Не абмініце

# На Мядзельшчыне ўспомняць Шастаковіча

## Вядомы кампазітар меў беларускія карані

**Беларуска-французскі канцэрт да 111-годдзя з дня нараджэння знакамітага кампазітара пройдзе заўтра ў вёсцы Нарач, у касцёле Святога Апостала Андрэя. Пачатак — а 15-й гадзіне.**

Мядзельшчына не выпадкова стала месцам музычных сустрэч, прысвечаных ушанаванню памяці і таленту вядомага творцы. Менавіта тут, у вёсцы Шэметава, некалі жыў прадзед Дзмітрыя Шастаковіча Пётр. Таму ў Шэметаве летась адбыўся першы канцэрт у межах праекта.

Ініцыятарам правядзення памятных музычных выступленняў стаў Аркадзь Валадось, вядомы оперны спявак, прэзідэнт французскай асацыяцыі "Абмен: Францыя—Беларусь", за сваю актыўную дзейнасць па распаўсюджанні беларускай культуры за мяжой ён удастоены медаля Францыска Скарыны.

Так, у Нарач заўтра завітаюць прафесійныя выканаўцы з Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, да іх далучыцца і вядомы габаіст з Францыі Жэром Гішар, лаўрэат Міжнароднага конкурсу ў Токіа, прафесар Ліёнскай кансерваторыі.

Ідэю правядзення канцэртаў у памяць пра выдатнага кампазітара падтрымалі старшыня Мядзельскага райвыканкама, а таксама пробашч касцёла Святога Андрэя ў Нарачы. Спадзяёмся, што праект атрымае працяг у будучыні, стане выдатным пацвярджэннем таму, што нават самы маленькі горад і вёсачка нашай краіны маюць багаты патэнцыял духоўнага, культурнага развіцця, які варта развіваць і падтрымліваць з дапамогай міжнародных праектаў і мясцовых ініцыятыў.

**Юзэфа ВОЎК**

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№ 7 (38)

■ Хронікі

# СТВАРАЛЬНІК БЕЛАРУСКАЙ МІЛІЦЫІ І «ЗВЯЗДЫ»

## Міхаіл Фрунзэ стаяў каля вытокаў нашай праваахоўнай сістэмы і найстарэйшай газеты



Карціна Ісака Бродскага, прысвечаная Фрунзэ. 1929 год.

**Сёлета адзначаецца стагоддзе беларускай міліцыі і аналагічная дата з дня заснавання «Звязды». Цікава, што і міліцыя, і газета паўсталі «на рэвалюцыйнай хвалі», а каля вытокаў іх стварэння нават стаяў адзін і той жа чалавек...**



Барэльеф, які ўпрыгожвае станцыю метро «Фрунзенская» ў беларускай сталіцы.

## За дзясяткам масак...

Васіленка, Міхайлаў, Трыфаныч, Арсеній, Пятроў, Шуйскі, Мірскі — здаецца, што перад намі спіс партыйнай падпольнай арганізацыі. Насамрэч за ўсімі гэтымі іменамі — адзін чалавек. Ён правёў на тэрыторыі Беларусі ўсяго паўтара года, пра якія, акрамя вех партыйнай дзейнасці, вядома не так шмат, але паспеў прыняць удзел у ключавых гістарычных падзеях. Нездарма яго імя толькі ў Мінску носяць вуліца, станцыя метро і цэлы раён. Здагадацца нескладана, гаворка пойдзе пра Міхаіла Васілевіча Фрунзэ.

Па паходжанні ён ніякага дачынення да Беларусі не меў: нарадзіўся ў далёкім Бішкеку ў сям'і малдаваніна і рускай. Дарэчы, сам Бішкек у савецкі час на працягу 65 гадоў называўся ў гонар Фрунзэ. Як расказваў дзяржаўны дзеяч у сваёй афіцыйнай аўтабіяграфіі, захапіўся ідэямі рэвалюцыі ён яшчэ ў гімназіі. З часу вучобы ў Пецярбургскім політэхнічным інстытуце стаў актыўным удзельнікам бальшавіцкага руху. Небяспечная на той момант дзейнасць прывяла да лагічнага выніку: маладога чалавека неаднаразова арыштоўвалі, прысудзілі да катаргі, а ў далейшым — за ўдзел ва ўзброеным супраціўленні паліцыі — і да смяротнага пакарання, прычым двойчы. Аднак самая суровая мера так і не была ўжытая. Рэвалюцыянер правёў сем гадоў на катарзе, пасля чаго быў адпраўлены на пасяленне і зноў арыштаваны. Праўда, зняволенне было нядоўгім: Фрунзэ ўдалося збегчы.

Першы вопыт рэдактарскай працы ён атрымаў у Чыце ў 1915 годзе, дзе хаваўся пад прозвішчам Васіленка. Там ён разам з аднадумцамі выпускаў штотыднёвую газету «Восточное обозрение». Змяніўшы дакументы на імя Міхаіла Міхайлава, трапіў на службу ў камітэт Заходняга фронту Усерасійскага земскага саюза ў Беларусь. Тут стварыў падпольную бальшавіцкую арганізацыю ў Мінску, а таксама партыйныя групы ў III і X арміях Заходняга фронту. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі стаў адным з кіраўнікоў рэвалюцыйнага руху на гэтай тэрыторыі.

## Беларускі перыяд

Адным з першых крокаў пасля змены дзяржаўнага ладу стала замена царскай паліцыі народнай міліцыяй з выбарным начальствам, якая падпарадкоўвалася органам мясцовага самакіравання. У Мінску гэта адбылося ноччу з 4 на 5 сакавіка 1917 года. Атрады баявых дружын рабочых і міліцыі раззброілі былую паліцыю, захапілі гарадское паліцэйскае ўпраўленне, архіўнае і доказнае аддзяленні, узялі пад сваю ахову найважнейшыя дзяржаўныя ўстановы, пошту і тэлеграф. У той жа дзень грамадзянскі камендант Мінска падпісаў прававы акт, згодна з якім Міхаіл Аляксандравіч Міхайлаў — Фрунзэ — прызначаўся часовым начальнікам міліцыі Усерасійскага земскага саюза па ахове парадку ў Мінску. Дарэчы, афіцыйнай датай святкавання Дня беларускай міліцыі 4 сакавіка стала толькі пасля 1998 года.

Між тым сам Фрунзэ высокай пасадай начальніка беларускай міліцыі не абмяжоўваўся. Праз некалькі месяцаў ён ужо быў старшынёй выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, арганізатарам і членам Мінскага гарадскога камітэта РСДРП, членам салдацкага камітэта Заходняга фронту і выканкама Мінскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а таксама рэдактарам «Сялянскай газеты» і адным з рэдактараў-заснавальнікаў «Звязды». У той час газета, якая пабачыла свет 27 ліпеня па старым стылі ці 9 жніўня па новым, успрымалася ў першую чаргу як сродак прапаганды бальшавіцкіх ідэй. Галоўным патрабаваннем да матэрыялаў была ідэалагічная выве因ранасць і здольнасць уздзейнічаць на чытача. Таму нічога дзіўнага ў тым, што іх падрыхтоўкай займаліся вядомыя партыйныя дзеячы, заўзятыя агітатары, няма.

Няшмат каму вядома, але былі спробы змяніць кірунак дзейнасці міліцыі. Дарэчы, гэты момант цесна пераплятаецца і з гісторыяй «Звязды». Хуткі рост папулярнасці і ўплыву бальшавіцкай газеты сур'ёзна занепакоіў штаб фронту, таму ваенны і марскі міністр Керанскі даў загад закрыць выданне і канфіскаваць друкарню. Аднак кіраўніцтва газеты з групай моладзі паспелі перавезці ўвесь набор чарговага нумара, і атрад міліцыі, які прыбыў на месца, нічога не знайшоў. Вось у гэтым моманце, здаецца, паўстала супярэчнасць: як Фрунзэ, знаходзячыся на пасадзе начальніка міліцыі, мог дапусціць практычна знішчэнне выдання, якім сам жа кіраваў? Адказ відавочны — ніяк. У гэты момант ён быў у камандзіроўцы, а губернскі камісар і яго служачыя паспрабавалі ўзяць уладу над міліцыяй у свае рукі. Як толькі Фрунзэ вярнуўся ў Мінск, ён склікаў агульны сход усіх супрацоўнікаў міліцыі, дзе была прынята рэзалюцыя супраць контррэвалюцыі.

Сама «Звязда» пачала выходзіць пад новай назвай «Молат». Усяго свет пабачыла 18 нумароў выдання, якое менш чым праз месяц было закрыта. А «Звязда» ў хуткім часе аднавіла сваё існаванне. Дарэчы, у выпуску, прысвечаным гадавіне існавання газеты, расказвалася гісторыя выратавання апошняга нумара «Молата», звязаная з Фрунзэ. Як толькі ён даведаўся аб загадзе закрыць выданне, то накіраваўся ў рэдакцыю, адкуль вывез увесь гатовы набор, а таксама іншыя матэрыялы ў друкарню газеты «Известия Минского Совета». Па яго ініцыятыве былі праведзены сходы і мітынгі ў воінскіх часцях у падтрымку газеты.

Вялікае значэнне надаваў Фрунзэ і прапагандзе сярод сялян. Нездарма падчас II сялянскага з'езда Мінскай губерні яго абралі старшынёй і нават называлі не інакш як «наш таварыш Міхайлаў». У канцы жніўня 1917 года Фрунзэ быў накіраваны ў горад Шую Уладзімірскай губерні і ў Беларусь больш не вярнуўся.

## Не герой, а асоба

У савецкі час Фрунзэ атрымаў статус аднаго з легендарных рэвалюцыянераў і военачальнікаў. У яго гонар былі названыя дзясяткі розных аб'ектаў па ўсім Саюзе, пра яго здымалі фільмы і пісалі кнігі, дзе ён паўставаў у ролі бездакорнага «змагара за Рэвалюцыю». Аднак за гэтым «забранзавелым» вобразам, вядома, хаваўся рэальны чалавек...

З Сямёнам Будзённым Фрунзэ пазнаёміўся яшчэ ў Мінску. Пасля Будзённы адзначаў яго дзіўны талент прамоўцы і запал, з якім той выступае на мітынгах. Георгій Жукаў у маладосці, падчас грамадзянскай вайны, убачыў военачальніка з іншага боку: «Ён спыніўся ў полі і загаварыў з байцамі нашага палка, цікавячыся іх настроем, харчаваннем, узбраеннем. Пытаўся, што пішуць родныя з вёсак, якія пажаданні маюцца ў байцоў. Яго прастата і абаяльнасць, прыемная знешнасць заваявалі сэрцы байцоў».

А вось Леў Троцкі меў аб Фрунзэ не самае лепшае меркаванне, што не дзіўна, бо ў іх быў сур'ёзны ўнутрыпартыйны канфлікт: «Яго захаплялі абстрактныя схемы, ён дрэнна разбіраўся ў людзях і лёгка падпадаў пад уплыў спецыялістаў, пераважна другарадных». У цэлым сучаснікі, нягледзячы на ўсе баявыя заслугі, характарызавалі Фрунзэ як чалавека вельмі мяккага, што адбілася і на яго палітычнай кар'еры.



Бюст военачальніка паблізу адміністрацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска.

Да гэтага часу афіцыйна нераскрытай застаецца таямніца смерці Фрунзэ, нечакана памерлага ў 1925 годзе падчас нескладанай аперацыі. Існуе меркаванне, што не абышлося без умяшання Сталіна. Асабліва распаўсюджанай стала гэтая версія пасля напісання Барысам Пільняком «Аповесці непагашанага месяца», дзе за персанажамі лёгка адгадваюцца сапраўдныя палітычныя фігуры. Пасля смерці мужа яго жонка Соф'я не вытрымала напружання і скончыла жыццё самагубствам. Праз некаторы час дваіх іх дзяцей усынавіў сябар Фрунзэ Клім Варашылаў. Дачка Таццяна стала доктарам хімічных навук, а сын Цімур лётчыкам-знішчальнікам. Ён загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны і пасмяротна атрымаў званне Героя Савецкага Саюза.

**Дар'я КАСКО.**
kasko@zviazda.by

■ Праблема

# ПАСЛЯ 21 (года) І ДА 22 (гадзін)

Чаму неабходна абмяжоўваць продаж алкаголю?



**Кожнае чацвёртае злачынства ўчыняецца асобамі ў стане алкагольнага ап'янення. Выпіў — страціў кантроль, а далей усё ў тумане... Празмернасць ужывання алкаголю вядзе да павышэння агрэсіўнасці і з'яўлення пачуцця «мне ўсё можна». І як вынік — бойкі, хуліганскія дзеянні, а нярэдка і забойствы.**

Наогул каля 80% злачынстваў, як, напрыклад, забойствы, нанясенні цяжкіх цялесных пашкоджанняў, рабаванні, разбоі, хуліганствы здзяйсняюцца злачынцамі ў нецвярозым стане. Дарэчы, апраўданне «я быў нападпітку, таму нічога не памятаю» пры вынясенні прысуду з'яўляецца не змякчальнай, а, наадварот, абцяжваючай акалічнасцю. Паступова колькасць такіх выпадкаў памяншаецца, аднак лічба па-ранейшаму застаецца жахліва вялікай: калі пяць гадоў таму было зарэгістравана больш за 21 тысячу злачынстваў, учыненых асобамі ў стане алкагольнага ап'янення, то летась — каля 17 тысяч.

— Эфектыўнасць паказваюць прафілактычныя меры, але ўсё ж самы дзейсны спосаб паўплываць на сітуацыю — розныя тыпы абмежаванняў рэалізацыі спіртных напояў, — расказала **выконваючая абавязкі начальніка аддзела арганізацыі работы ўчастковых інспектараў міліцыі ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Вольга САКАЛОЎСКАЯ.** — Гэта не пустыя словы. У нас ёсць статыстычнае пацвярджэнне, што ў раёнах, дзе спіртное нельга было купіць пасля 22 гадзін, колькасць злачынстваў прыкметна знізілася. Неабходна абмежаваць рэалізацыю алкаголю хоць бы з 23 да 6-й раніцы, у ідэале — з 22 да 9-й раніцы. Бо значная доля злачынстваў прыпадае на вячэрні і начны час, асабліва «актыўнай» у гэты час становіцца моладзь.

Менавіта з гэтай прычыны МУС падтрымлівае ініцыятыву змяніць узрост, з якога можна будзе набываць і ўжываць усе віды спіртных напояў, у тым ліку і слабаалкагольных: з 18 на 21 год. Прычынай стала тое, што ў гэты ўзроставы перыяд назіраецца «ўсплёск» здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў на глебе алкагольнага ап'янення. Наогул на іншых правах і абавязках гэта ніяк не адаб'ецца, паўналетнім па-ранейшаму будзе лічыцца той, хто дасягне васямнаццаці. Акрамя таго, гаворка пакуль не ідзе і пра тое, каб забараніць 18—20-гадовым маладым людзям знаходзіцца на тэрыторыі бараў і клубаў, як, напрыклад, гэта зроблена ў ЗША.

— Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб Адміністрацыйных правапарушэннях (артыкул 12.7, часткі 6,7), пакаранне за продаж алкаголю непаўналетнім даволі суровае: штраф у памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь, за паўторнае парушэнне — ад трыццаці да пяцідзесяці базавых, прычым у гэтым выпадку адказнасць нясе не толькі прадавец, але і юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік, на якога ён працуе. Як і ва ўсіх астатніх выпадках, няведанне не вызваляе ад адказнасці, так што просьба прад'явіць дакументы павінна гучаць нават пры мінімальным сумненні, — адзначыла Вольга Сакалоўская.

Пры гэтым пакаранне прадугледжана і для саміх непаўналетніх. Калі падлетку споўнілася 16 гадоў і яго затрымалі ў стане алкагольнага ап'янення, вынікам можа стаць улік у інспекцыі па справах непаўналетніх. Калі ж парушальнік не дасягнуў нават 16-гадовага ўзросту, адказнасць за яго правіннасць кладзецца на бацькоў. У выпадку наяўнасці доказаў, што гэта адбылося з-за таго, што бацькі або асобы, якія іх замяняюць, не выканалі свае абавязкі па выхаванні дзіцяці (артыкул 9.4 КоАП) іх чакае папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дзесяці базавых велічынь. Падобнае паўтарылася на працягу года — накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да дваццаці базавых велічынь.

— Нягледзячы на тое, што цяпер спіртное можна купляць толькі з 18 гадоў, каля 15% усіх асоб, якія здзяйсняюць злачынствы ў стане алкагольнага ап'янення, з'яўляюцца непаўналетнімі. Нават калі б гэта быў 1%, лічбу можна было б назваць велізарнай, бо гэта датычыцца, па сутнасці, дзяцей. Таму мы і выступаем з ініцыятывамі, заклікаючымі ўсімі магчымымі спосабамі знізіць спакусу ўжыць алкаголь. У прыватнасці, распрацоўваецца праект, паводле якога аддзелы з алкагольнай прадукцыяй у крамах будуць ізаляванымі, каб дзіця ў пошуках цукерак не магло выпадкова туды зайсці. Тое ж самае датычыцца і масавых мерапрыемстваў. У органаў мясцовай улады ёсць магчымасць абмяжоўваць продаж спіртных напояў на пэўнай тэрыторыі падчас той ці іншай падзеі. І нярэдка яны карыстаюцца гэтым правам, — растлумачыла Вольга Сакалоўская.

Між тым міліцэйскія зводкі стракацяць апісаннямі злачынстваў з названнем выяўленых у крыві віноўніка праміле алкаголю. Напрыклад, на гэтым тыдні трыццацігадовы мужчына збіў сяброўку сваёй маці, якая прыйшла да іх у госці. Яны ўтраіх сабраліся за "святочным" сталом, але, мабыць, не змаглі дамовіцца аб агульнай тэме размовы. Ці магло такое адбыцца «на цвярозую галаву»? Хочацца верыць, што не. Алкаголь даводзіць да таго, што людзі падымаюць руку не толькі на знаёмых, але і на сваіх самых блізкіх. Выпадкі, калі нападпітку дзеці крыўдзяць сваіх пажылых бацькоў, ужо ні для каго не навіна. Але справа п'янага бацькі-забойцы з Гомельскай вобласці, які пазбавіў жыцця сваіх непаўналетніх сына і дачку, узбурыла ўсю краіну. А колькасць і жудасць ДТЗ, учыненых п'янымі кіроўцамі, і ўвогуле не паддаецца вымярэнню... Усё гэта наводзіць на думкі аб тым, што абмяжоўваць продаж алкаголю неабходна, магчыма, нават і больш строга ■

■ Сітуацыя

# НА ВУДУ — ДОБРААХВОТНА

Па якую працу дзяўчаты зараз едуць за мяжу?

**30 ліпеня адзначаецца Сусветны дзень барацьбы з гандлем людзьмі. Нягледзячы на тое, што цяпер прафілактыцы гэтай праблемы ўдзяляецца вельмі шмат увагі, усё роўна знаходзяцца тыя, хто вядзецца на прывабныя прапановы «аб працы за мяжой». Праўда, з 2001 года, калі ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь з'явіўся артыкул, які рэгулюе пакаранне за гэты тып злачынстваў, «тэндэнцыі» ў дадзенай сферы крыху змяніліся.**

Па словах **начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Дзмітрыя ЦАЮНА,** псіха-ўзроставы партрэт ахвяры гандлю людзьмі не змяніўся. Часцей за ўсё гэта дзяўчына ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў з вышэйшай альбо сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якая не знаходзіцца ў шлюбе, але, магчыма, самастойна выхоўвае аднаго або некалькіх дзяцей. І галоўны фактар — яна мае патрэбу ў паляпшэнні свайго дабрабыту.

А вось спосабы вярбоўкі за апошнія 15 гадоў сталі іншымі. Па-першае, галоўным каналам стаў інтэрнэт. Па-другое, дзяўчат больш не спрабуюць прывабіць на заробкі падманным шляхам, расказваючы, што яны будуць збіраць клубніцы ў Швейцарыі ці цыльпаны ў Егіпце, дзе яны нават не растуць. Усё ж такі сродкі масавай інфармацыі і прапаганда зрабілі сваю справу — нават самыя наіўныя больш не вядуцца на такі «развод». Цяпер вярбоўшчыкі шукаюць юных асоб менавіта для заняцця прастытуцыяй. Падманваюць яны іх у іншым — умовах пражывання і працы, велічыні аплаты, тэрміне знаходжання за мяжой і гэтак далей.

— Дзяўчаты, якія адважыліся на такі крок, не разумеюць, што іх не ўспрымаюць як асоб, яны — жывы тавар, які павінен прынесці велізарны прыбытак. Дабрачынцаў, як і добрых умоў, у гэтай справе не бывае, — адзначыў Дзмітрый Цаюн.

Летась было выяўлена 152 выпадкі трафікінгу і ўстаноўлена 62 яго ахвяры, за шэсць месяцаў гэтага года — 69 і 22 адпаведна. З пачатку 2017 года на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь спынена дзевяць каналаў вывазу жанчын для прастытуцыі ў Расію, Кіпр, Турцыю, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Германію.

Зусім нядаўна супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Віцебскага аблвыканкама раскрылі канал пастаўкі «жывога тавару» ў ФРГ. Арганізаваў «бізнес» 36-гадовы, раней не судзімы віцяблянін, дапамагаў яму 39-гадовы прыяцель. Складанасць выкрыцця злачынцаў была ў тым, што амаль увесь час яны знаходзіліся ў Германіі, асабіста кантралюючы справу.

Дзяўчаты, якіх падштурхнула на гэта цяжкае матэрыяльнае становішча, працавалі ў бардэлях у гарадах Лютцэльбах і Хамінкельн. Устаноўлена, што яны прыносілі сваім «работадаўцам» каля 20 тысяч еўра штомесяц, самі ж, з-за сістэмы ўнутраных штрафаў «установы», атрымлівалі не больш за 200. Падчас праведзенага комплексу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў было ўстаноўлена пяць ахвяр злачыннай дзейнасці сутэнёраў, якія цяпер знаходзяцца пад следствам.



Нярэдка ахвяры трафікінгу праз некаторы час і самі становяцца вярбоўшчыцамі. Так паступіла мінчанка, грамадзянская жонка гаспадара аднаго з бардэляў у паўночным Кіпры. Яна прыцягвала да заняткаў прастытуцыяй сваіх суайчынніц і жыхарак суседніх краін. Цяпер жанчына асуджаная на 13 гадоў, сярод артыкулаў абвінавачання ёсць і збыт наркотыкаў.

Злачынствамі, якія адносяцца да катэгорыі «гандаль людзьмі», акрамя трафікінгу лічаць таксама абарот парнаграфіі і злачынствы сексуальнага характару ў дачыненні да дзяцей. Усяго летась было выяўлена 1374 такія злачынствы, за шэсць месяцаў гэтага года — 1007. Расце колькасць выпадкаў, звязаных менавіта з педафіліяй. Таму МУС сумесна з парламентам краіны выступіла з прапановай дадаць у Крымінальны кодэкс асобны артыкул, які будзе рэгуляваць пакаранні за псіхалагічную падрыхтоўку дзіцяці ў інтэрнэце дзеля сексуальных адносін з ім (так званы «грумінг»).

У мінулым годзе быў затрыманы кіраўнік фірмы, які паўтара года прыцягваў непаўналетніх дзяўчатак ад 13 да 16 гадоў да заняцця прастытуцыяй на тэрыторыі Беларусі. Ён абяцаў дзяўчатам падбіраць іх дзейнасці высокапастаўленымі кліентамі. Устаноўлена 38 ахвяр і 42 эпізоды. Злачынец асуджаны да 11 гадоў зняволення.

Становяцца ахвярамі міжнародных злачынных арганізацый і мужчыны, але калі жанчынам часцей за ўсё пагражае сексуальнае рабства, то мужчынам — працоўнае. Літаральна на гэтым тыдні быў выяўлены выпадак выкрадання грамадзяніна Беларусі на тэрыторыі Польшчы. Мужчына накіроўваўся да свайго работадаўца, аднак на вакзале быў схоплены злачынцамі. Дзякуючы суладнай працы беларускіх і польскіх праваахоўнікаў ён быў знойдзены на працягу некалькіх дзён. Увогуле, у нашага Міністэрства ўнутраных спраў наладжаны цесныя сувязі з калегамі з многіх замежных краін, напрыклад Расійскай Федэрацыі, Украіны, Кітая, Бельгіі, Германіі.

Начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС нагадаў, што рэальнасць існавання і род заняткаў замежнага работадаўцы абавязкова неабходна праверыць, у выпадку ўзнікнення праблем на гэтым этапе трэба звярнуцца ў міліцыю. Калі вы апынуліся ў складанай сітуацыі ў іншай краіне, то ў першую чаргу неабходна звязацца з пасольствам або консульствам Рэспублікі Беларусь. Не варта баяцца звяртацца з заявай у міліцыю па вяртанні на радзіму: ахвяры трафікінгу праходзяць па справе ў якасці пацярпелых, за заняцце прастытуцыяй у іншай краіне пад пераслед яны не падпадаюць ■

❍ У ТЭМУ

## «ВЫВУЧАЙ. ДЗЕЙНІЧАЙ. ПАДЗЯЛІСЯ»

### Маладзёжны лагер супраць трафікінгу быў арганізаваны ў Беларусі

**18 актыўных маладых людзей з усёй Беларусі ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў на працягу пяці дзён вывучалі пытанні бяспечнай міграцыі і процідзеяння гандлю людзьмі. Ініцыятарам правядзення форуму пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства замежных спраў выступіла Міжнародная арганізацыя па міграцыі.**

Год таму Рэспубліка Беларусь далучылася да глабальнай кампаніі «МАМ-ІКС: Спынім гандаль людзьмі», стаўшы першай краінай, якая падтрымала кампанію за межамі Ціхаакіянскага рэгіёна, адкуль пачаўся рух. Адна з асноўных задач кампаніі — прыцягнуць да тэмы маладых актывістаў і натхніць іх зрабіць свой унёсак у барацьбу з гэтай глабальнай праблемай. Удзельнікамі лагера сталі валанцёры, сацыяльныя работнікі, педагогі і проста неабыякавыя да тэмы маладыя людзі, якія былі адабраны журы на аснове заявак і матывацыйных лістоў.

Праграма лагера вельмі насычаная: пяць дзён падчас заняткаў удзельнікі разам з экспертамі ў гульнявой і інтэрактыўнай форме абмяркоўвалі не толькі супрацьдзеянне трафікінгу, але і сумежныя тэмы — гендарную роўнасць, праблему дамашняга гвалту, ВІЧ і СНІД, а таксама грамадзянскую адказнасць, здаровы лад жыцця і многае іншае. Акрамя таго, у актывістаў была магчымасць развіць свае камунікатыўныя і лідарскія навыкі, прайсці курс у «Школе відэаблогера» і «Майстэрні сацыяльнага кіно», падвысіць кампетэнтнасць у сферы інтэрнэт-бяспекі. Мяркуецца, што пасля навучання ўдзельнікі далучацца да дзейнасці грамадскіх арганізацый і будуць займацца прапагандай тэмы сярод аднагодкаў. Дарэчы, у Беларусі на цяперашні момант акрамя грамадскіх арганізацый больш за 15 ведамстваў займаюцца пытаннямі процідзеяння гандлю людзьмі.

Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я КАСКО. kasko@zviazda.by

ЗВЯЗДА Падарожжа праз 100-годдзе

# Як «Звязда» пісала гісторыю (1976—1986)

**Будаўніцтва і адкрыццё Мінскага метрапалітэна, увядзенне абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістан, рэкорды ў спаборніцтвах Алімпіяды-80 і ў пакарэнні космасу, трагічная гібель Пятра Машэрава, балет «Лебядзінае возера» як сімвал смерці ў найвышэйшых партыйных эшалонах, антыалкагольная кампанія, паскарэнне і іншыя заклікі перабудовы, ідэалагічныя віткі «халоднай вайны» і пратэсты супраць гонкі ўзбраенняў, а яшчэ катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, попел якой накрыў краіну на многія дзесяцігоддзі... І гэта толькі частка знакавых падзей 1970—80-х гадоў, якія журналісты «Звязды» пражылі разам з героямі сваіх публікацый і чытачамі. Што і як пісала газета пра жыццё сучаснікаў?**

## ЛІЧБЫ І ЛІТАРЫ

«Ударныя тэмпы, высокая якасць работы — пад такім дэвізам пачалі дзясятую пяцігодку працоўныя нашай рэспублікі», — паведамляе «Звязда» ў першыя дні 1976-га.

Як і ў мінулым дзесяцігоддзі, круглыя даты і прыгожыя лічбы ў газеце сустракаюцца з зайздроснай рэгулярнасцю. Заклікі ўзняць вышэй сцягі сацспаборніцтва да XXV з'езда КПСС змяняюцца рэпартажамі з мерапрыемстваў да 60-годдзя Кастрычніка, а тыя — справаздачамі аб шырокамаштабнай падрыхтоўцы да 60-годдзя БССР, тэматычнымі падборкамі да 60-годдзя Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, святочна-аналітычнымі артыкуламі да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў — 100-х угодкаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, 80-годдзя Кандрата Крапівы, 90-годдзя Змітрака Бядулі і Максіма Багдановіча і г. д.

Дарэчы, напярэдадні 60-годдзя БССР здзейснілася знакавая для рэспублікі падзея: летам 1978-га генсек ЦК КПСС Леанід Брэжнеў прыбыў у Мінск і ўласнаручна прымацаваў да сцяга горада-героя дзве ўзнагароды — ордэн Леніна і медаль «Залатая Зорка». Тое, што кіраўніку кампартыі БССР Пятру Машэраву і яго паплечнікам дабівацца гэтых узнагарод давялося некалькі гадоў, у газетных перадавіцах не адлюстравана — наадварот, у прамове, якую цытуе «Звязда», Машэраў ад імя беларускага народа выказаў выключную ўдзячнасць і гарачае імкненне «ісці абавязкова далей, дабівацца большага, усё рабіць лепш, усё рабіць больш якасна». Але факт застаецца фактам: сваю Зорку Героя на found ўласны пасля ўрачыстасці Мінск-такі атрымаў!

*«Афіцыйныя» даты накшталт 60-годдзя ўтварэння БССР і адзначаліся афіцыйна — з прыёмам у Мінску вялікіх дэлегацый з Масквы, Ленінграда і ўсіх саюзных рэспублік, з пафаснымі пасяджэннямі і прамовамі, якія цэлымі «прасцінамі» друкавала «Звязда». Але разам з тым газета знаходзіла час і месца, каб ладзіць іншыя, значна менш фармальныя святы. Так, карыстаўся папулярнасцю 30-кіламетровы прабег Курган Славы—Плошча Перамогі, які рэдакцыя «Звязды» ладзіла штогод сумесна з цэнтральным саветам ДСТ «Чырвоны Сцяг». У 1978 годзе «ўдзел у спаборніцтве ўзяла рэкордная на той час колькасць удзельнікаў — 164 чалавекі, якія прадстаўлялі ўсю краіну». Нагадаем, на ўвазе мелася савецкая краіна, таму адрасы лёгкаатлетаў — Масква, Мінск, Барнаул, Ерэван, Калуга, Тула, Кіеў, Калінінград, Даўгаўпілс, Смаленск, Мурманск... Дарэчы, у тым забегу перамог мінчанін, Барыс Адамовіч, які пераадолеў 30 кіламетраў за 1 гадзіну 37 хвілін і 35 секунд. А ўсяго праз некалькі гадоў, у 1985-м, колькасць удзельнікаў прабегу склала 11 тысяч чалавек!*

## РУКІ НА ПУЛЬСЕ

Адна з пастаянных тэм у гэты час — рэйды і праверкі, якія карэспандэнты ладзяць для прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. «Звязда» пачынае выдаваць дадатак «Народны кантроль». Акрамя таго, у 80-я з'яўляецца рубрыка «Селектар «Звязды» — аналаг сучаснага «гарачага тэлефона» для сельскай гаспадаркі, якая інфармуе аб ходзе веснавой сяўбы, уборкі ўраджаю, нарыхтоўкі кармоў і іншых важных тэм. Пастаянна выходзяць і спецвыпускі «Прысяга» («Клуб абаронна-патрыятычнага выхавання») і «Крылы» (падборка артыкулаў на тэмы выхавання падлеткаў і моладзі).



Чарга працоўных на развітанне з П. М. Машэравым.

*Пад увагай і працяг асваення космасу. У 1978—79 гадах практычна штодня друкуюцца звесткі аб рабоце савецка-польскага пілатуемага комплексу «Салют-6»—«Саюз-29», аўтаматычнага грузавога транспартнага карабля «Прагрэс-2», штучнага спадарожніка «Космас-1027» і іншых даследчых касмічных апаратаў. З асаблівым гонарам журналісты сачылі за палётам нашага земляка, ураджэнца вёскі Белае Крупскага раёна Уладзіміра Кавалёнка, які правёў на*



Пакаральнікі космасу — адны з любімых герояў беларускага скульптара лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР І. Я. Міско. Гэтымі днямі яго майстэрню наведала маці першага касманаўта Г. Ц. Гагарына, якая пазнаёмілася з касмічнай серыяй скульптара. У творчых планах І. Я. Міско стварыць бюст маці Юрыя Гагарына.

На здымку: Ганна Цімафееўна Гагарына ў майстэрні Івана Якімавіча Міско.

Фота Я. Пясецкага.

Пакарэнне космасу — адна з цэнтральных тэм у 80-я.

*касмічнай арбіце 140 сутак — гэта быў самы доўгі палёт на той час!*

*У 1978-м карэспандэнт «Звязды» А. Калеснік завітаў у госці да матуляў беларускіх касманаўтаў — Марфы Паўлаўны Клімук і Вольгі Іванаўны Кавалёнак, — і апошняя прыгадала ўражальны выпадак: «У падлеткавым узросце Валодзя, які хадзіў у школу за 6 кіламетраў, вярнуўся ледзь не з абмарожанымі нагамі — згубіў разарваную абкрутку, якая замяняла боты. Мы з маці ўсю ноч плялі з вяровак лапці, а раніцой зноў выправілі: «Ідзі, вучыся, сынок!»*

1980-ы праходзіць пад знакам Алімпійскіх гульняў, якія прымала не толькі Масква, але і таксама Ленінград, Мінск і Кіеў, дзе праходзіла частка футбольных матчаў. Беларуская сталіца, у прыватнасці, прымала 4 каманды футбольнага турніру: ГДР, Іспанію, Алжыр і Сірыю. Праўда, спартыўнае свята было азмрочана палітычнымі гульнямі: шэраг краін байкатаваў Алімпіяду ў СССР. Вось як публікацыя ад 17 ліпеня 1980 года апісвае «недарэчны антыалімпійскі фарс»: «Міжнародныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы ў Філадэльфіі (ЗША) прадстаўленыя як «буйнейшая міжнародная спартыўная падзея», хоць удзел у ёй прыме толькі нязначная колькасць спартсменаў з 9 краін, уключаючы Барбадос. Задуманы гэтыя сурагатныя спаборніцтвы з яўнай мэтай паспрабаваць супакоіць абураных тых амерыканскіх спартсменаў, якіх Белы дом пазбавіў магчымасці ўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях у Маскве».

## ВЯЛІКІЯ БУДОЎЛІ...

31 снежня 1976 года Мінскі аэрапорт адправіў у палёт мільённага пасажыра — паводле «Звязды», шчаслівы нумар выпаў на настаўніцу Ратамскай сярэдняй школы Н. В. Фірсаву, якая накіроўвалася на Новы год у Маскву і атрымала ў якасці падарунка бясплатны білет і авіясувенір. А ўжо праз два гады за 35 км ад сталіцы пачалося будаўніцтва міжнароднага аэрапорта «Мінск-2», які планавалася адкрыць у 1982-м. «Узлётна-пасадачная паласа зможа прымаць самыя сучасныя самалёты — звышгукавыя лайнеры «ТУ-144», аэробус «ІЛ-86» на 350 пасажыраў», — анансуе газета.

Акрамя таго, увесну 1977-га пачалося будаўніцтва першай лініі мінскага метро, за пракладкай 8600 метраў якога «Звязда» пільна сачыла на кожным этапе, а напярэдадні адкрыцця — 29 чэрвеня 1984 года, да 40-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — падрыхтавала вялікі рэпартаж. «Пасажырскі транспарт у Мінску пачынаўся з конкі, — успаміналі журналісты. —



Год 1976-ы. «Кожны дзень у строга вызначаны час канвеер Мінскага гадзіннікавага завода спыняе свой бег. Інструктары вытворчай гімнастыкі запрашаюць рабочых на фізкультурную пяціхвілінку».

Конку замяніў трамвай, затым на вуліцах горада з'явіліся аўтобусы і тралейбусы. Многія мінчане памятаюць, што маршрут першага тралейбуса не так даўно заканчваўся прыпынкам «Абсерваторыя». А далей — поле, вёска Сцяпянка. Цяпер амаль на гэтым месцы станцыяй «Маскоўская» пачынаецца лінія мінскага метрапалітэна».

Наогул «Звязда» старалася не выпускаць з-пад увагі ніводнага значнага аб'екта, падрабязна расказваючы і пра закладку ўнікальнай экспазіцыі пад адкрытым небам — Музея народнай архітэктуры і быту, ідэю стварэння якога агучыў газеце пісьменнік Уладзімір Караткевіч, і пра ўзвядзенне новага Палаца піянераў і школьнікаў (цяпер — дзяцей і моладзі), і пра будаўніцтва Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, 4-га Салігорскага калійнага завода, і, натуральна, пра аб'екты для Алімпійскіх гульняў 1980 года: узводзімы беларусамі гасцінічны комплекс у маскоўскім Ізмайлаве і рэканструяваны стадыён «Дынама» ў Мінску. На апошнім, піша «Звязда», павялічылася заходняя трыбуна, што дало 8 тысяч дадатковых гледацкіх месцаў, з'явіліся ложы для прэсы, ганаровых гасцей, каментатарскія кабіны, а таксама «чатыры ажурныя вышкі з батарэямі магутных пражэктараў, што дадуць magчымасць трансліраваць матчы па каляровым тэлебачанні ў вячэрні час».



ПРЫКЛАД УДАРНІКАЎ

МІТЫНГ У АКАДЭМІІ

УЗНАГАРОДЫ УРУЧАНЫ

Да юбілейных дат прымяркоўваліся шматлікія працоўныя рэкорды.

## ...І ВЯЛІКІЯ СТРАТЫ

4 кастрычніка 1980 года Беларусь засталася без свайго «партызанскага кіраўніка»: у аўтакатастрофе загінуў Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Пётр Машэраў. Безумоўна, яго гібель мела шырокі рэзананс, расследавалася на вышэйшым узроўні, і гэтак жа безумоўна ніякіх падрабязнасцяў аб ходзе следства СМІ таго часу не друкавалі. Некалькі тыдняў «Звязда» змяшчала спачуванні, якія дасылалі беларускаму ўраду кіраўнікі іншых сацыялістычных і капіталістычных краін, міжнародныя арганізацыі, а таксама працоўныя калектывы ўстаноў, прадпрыемстваў і сельскіх гаспадарак, грамадскія дзеячы і простыя людзі з усяго Савецкага Саюза. Камсамолка 20-х гадоў Э. Яцкевіч з Мінска, напрыклад, напісала ў газету: «Пётр Міронавіч Машэраў быў верным ленінцам і нястомна працаваў над задачамі партыі Леніна, якая праз цяжкасці, голад і холад прывяла нас да шчаслівага жыцця. Разам з усёй маёй Беларуссю, разам з пяцю дзецьмі, сямю ўнукамі і двума праўнукамі глыбока смуткую з прычыны заўчаснай смерці лепшага сябра людзей, Героя вайны і працы, дарагога ўсім нам Пятра Міронавіча».

Напрыканцы 1980 года, згадвае «Звязда», у Віцебску быў адкрыты помнік Машэраву аўтарства З. Азгура, налета Паркавая магістраль Мінска была перайменавана ў праспект Машэрава, таксама яго імя атрымала марское судна і станкабудаўнічы завод аўтаматычных ліній.

Наступны «чорны» нумар выйшаў 11 лістапада 1982 года. Менавіта ў гэты дзень савецкія газеты (як і тэлебачанне, па якім напярэдадні замест святочнага канцэрта да Дня міліцыі транслявалі сімфанічную музыку і балет «Лебядзінае возера») паведамілі пра смерць генсека ЦК КПСС Леаніда Брэжнева — як адзначалася ў афіцыйным медыцынскім заключэнні, з прычыны «раптоўнага спынення сэрца». Наогул, у 80-я «Звяздзе» давялося друкаваць шмат партыйных некралогаў: напачатку 1983 года не стала кіраўніка БССР Ціхана Кісялёва, у 1984-ым — генсека ЦК КПСС Юрыя Андропава, у тым жа годзе — яго наступніка Канстанціна Чарненкі...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
tselyashuk@zviazda.by

***(Заканчэнне ў наступным нумары).***

# Дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «ШЧУЧЫНСКІ ЛЯСГАС» ГРОДЗЕНСКАГА ДВЛГА

231513, Гродзенская вобласць, г. Шчучын, вул. Куйбышава, 3. Тэл. (01514) 27 0 85



Майстар лесу Зачэпіцкага лясніцтва Нінартовіч Андрэй Пятровіч.



Шчучынскае лясніцтва: ляснік Шкода Андрэй Яновіч, майстар лесу Круціца Станіслаў Міхайлавіч.



Курылавіцкае лясніцтва: ляснік Гайдаш Аляксандр Іванавіч, майстар лесу Ражко Аляксандр Пятровіч.



Вадзіцель аўто на вывазцы лесу Адаська Іван Іванавіч.



Начальнік лесагадавальніка Трахімчык Аляксандр Міхайлавіч.



Вальшчык лесу Гурнофельскага лясніцтва Ляпеша Вальдэмар Станіслававіч.




Ляснік Малькавіцкага лясніцтва Халько Аляксандр Уладзіміравіч.



Машыніст тралёвачнай «лесанарыхтоўчай» машыны Юшкевіч Станіслаў Казіміравіч.



Начальнік лесапункта Вайцюль Генадзь Францавіч.



Ляснік Мастоўскага лясніцтва Варабей Міхаіл Міхайлавіч.



Бухгалтар Ражанкаўскага лясніцтва Бачко Ала Валяр'янаўна.





Трактарыст па падрыхтоўцы лесасек, тралёўцы і вывазцы лесу Шчучынскага лясніцтва Пракаповіч Андрэй Станіслававіч.

УНП 500191970

## Брытанскі архітэктар:

# «МОЖНА ВЕЛЬМІ МНОГАМУ НАВУЧЫЦЦА Ў ВАШАГА ТРАДЫЦЫЙНАГА ДОЙЛІДСТВА»

### Чаму беларуская царква стала ўлюбёным будынкам лонданцаў

**Збудаваная ў 2016 годзе беларуская царква ў Лондане працягвае збіраць прызы самых разнастайных архітэктурных конкурсаў. Раней яна атрымлівала ўзнагароду Каралеўскага інстытута брытанскіх архітэктараў і трапляла ў лік 50 найлепшых будынкаў Вялікабрытаніі. А зусім нядаўна перамагла ў намінацыі «Народны выбар» конкурсу New London Architecture — перамогу прынесла інтэрнэт-галасаванне, удзел у якім бралі карыстальнікі сеціва. Акрамя гэтага, яна трапіла ў шорт-лісты ў трох іншых намінацыях: «Самы энергаэфектыўны будынак», «Культура і грамадства» і Ashden Prize. Усяго ўдзел у конкурсе бралі больш за 400 збудаванняў, узведзеных у Лондане ў 2016 годзе. Адметна, што часцінка Беларусі ў сталіцы Вялікабрытаніі з'явілася дзякуючы намаганням... выхадца з Кітая. Архітэктар Со ЦЗЫЎАЙ стварыў для нашай дыяспары бліскучы праект, якім можа ганарыцца кожны беларус. Пра тое, як стваралася царква ў гонар святога Кірылы Тураўскага, а таксама пра свае крыніцы натхнення ён расказаў «Звяздзе».**



Со Цзыўай падчас работы над праектам царквы.

***— Найперш хацелася б спытаць, як вы ўвогуле аказаліся ў Лондане?***

— Спачатку я навучаўся на архітэктара ў Ганконгу, а ў сталіцу Вялікабрытаніі пераехаў па заканчэнні універсітэта. Увогуле, Англія — гэта натуральны выбар многіх грамадзян Ганконга, бо ён быў калоніяй Аб'яднанага Каралеўства на працягу больш як 150 гадоў. Адпаведна, многія рэчы, у тым ліку сістэма адукацыі, вельмі падобныя. Я атрымаў ліцэнзію на работу архітэктарам у Вялікабрытаніі, а пазней стаў грамадзянінам гэтай краіны. Цяпер працую архітэктарам і дырэктарам студыі Spheron Architects і з'яўляюся членам праўлення Heritage Trust Network — дабрачыннага фонду, які займаецца захаваннем архітэктурнай спадчыны Вялікабрытаніі.

***— Наколькі я ведаю, вы цесна супрацоўнічаеце з беларускай дыяспарай. Як так атрымалася?***

— Гэта была чыстая выпадковасць. Мы сустрэліся па працоўных пытаннях каля дзесяці гадоў таму. Прадстаўнікі дыяспары прадавалі адзін з будынкаў, які ім належаў, забудоўшчыку, а я працаваў на апошняга ў якасці архітэктара. Пачаў праводзіць з імі шмат часу, і многія паступова сталі маімі сябрамі. Так і «ўліўся» ў супольнасць.

***— Як нарадзілася ідэя стварыць у Лондане беларускую царкву?***

— Насамрэч задума далёка не новая. Беларуская дыяспара сфарміравалася ў сталіцы Вялікабрытаніі адразу пасля Другой сусветнай вайны. Вернікі (пераважна грэка-каталікі) пачалі маліцца ў адным з дамоў з 1947 года — гэта значыць якраз 70 гадоў таму. Увесь гэты час іх калектыўным жаданнем было займець сапраўдную, спецыяльна пабудаваную для рэлігійных мэт царкву. Але гэта мара ніяк не магла спраўдзіцца, нягледзячы на тое, што да працы прыцягвалі вялікую колькасць іншых архітэктараў яшчэ да мяне. Шэсць гадоў таму яны прапанавалі заняцца гэтым праектам мне, і на гэты раз усё атрымалася.

***— Што стала для вас крыніцай натхнення?***

— У першую чаргу я натхняўся драўлянымі барочнымі цэрквамі, якія будавалі ў Беларусі ў XVIII стагоддзі. Я шмат падарожнічаў па сельскай мясцовасці ў вашай краіне — пераважна, паміж Гроднам і Лідай, таксама быў у Косаве, Мінску, Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Замаляваў некалькі цудоўных прыкладаў такіх збудаванняў. Яны неймаверна ўнікальныя, і я шчыра спадзяюся: беларускія ўлады зробяць усё магчымае, каб іх уключылі ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Бо яны там сапраўды мусяць быць.

Увогуле, новая драўляная беларуская царква ў Лондане павінна служыць дзвюм мэтам. Першая, зразумела, — быць месцам, дзе будуць праводзіцца службы. А другая — з'яўляцца сімвалічным напамінам аб вялікай колькасці таких самых цэркваў — спадчыне беларускага драўлянага дойлідства, страчанай падчас Другой сусветнай вайны і пасля Чарнобыльскай катастрофы.

***— Царква выглядае вельмі аўтэнтычна, але адначасова вельмі сучасна. Ці ёсць нешта падобнае да яе ў сталіцы Вялікабрытаніі?***

— З шэрагу прычын наша драўляная царква дастаткова ўнікальная. Каралеўскі інстытут брытанскіх архітэктараў характарызаваў яе так: «Вельмі асаблівы будынак». Таму што гэта твор XXI стагоддзя, насычаны беларускім сімвалізмам. Я сказаў бы так — гэта своеасаблівы «архітэктурны шлюб» паміж сучаснай брытанскай архітэктурай і архітэктурай беларускіх драўляных цэркваў XVIII стагоддзя. Акрамя таго, гэта адзіная драўляная царква ва ўсёй сталіцы Аб'яднанага Каралеўства. Унікальнасць будынка для брытанскай архітэктуры была адзначана як іншымі архітэктарамі, так і грамадствам. Сярод шматлікіх узнагарод, якія яна атрымала, ёсць вельмі прэстыжная прэмія RIBA (Каралеўскага інстытута брытанскіх архітэктараў. — **Аўт.**). Яна была выбрана публікай як найбольш упадабаны новы будынак у Лондане ў 2017 годзе, гэта вялікі гонар. Дарэчы, царкву назвалі і адным з найбольш энергаэфектыўных будынкаў Лондана, мы атрымалі другое месца ў намінацыі Ashden Prize, якая ўручаецца дабрачынным фондам Эшдана, што займаецца развіццём альтэрнатыўных крыніц энергіі. Саступілі толькі аналагічнаму цэнтру шпіталя Гай, які за 160 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў спраектаваў Рычард Роджэрс (знакаміты брытанскі архітэктар, адзін са стваральнікаў стылю «хай-тэк», аўтар будынкаў Цэнтра Пампіду ў Парыжы, Еўрапейскага суда па правах чалавека ў Страсбургу, праекта аднаўлення Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку і інш. — **Аўт.**).

***— Ці была перамога ў конкурсе New London Architecture прадказальнай для вас?***

— Ні ў якім разе, гэта была абсалютная нечаканасць! Спачатку з ліку 400 новых будынкаў Лондана прафесійнае журы адабрала 160 найлепшых праектаў, за якія галасавалі ўжо карыстальнікі інтэрнэту. І менавіта нашу царкву выбрала публіка з ліку многіх знакамітых будынкаў. Мы абышлі, напрыклад, такіх канкурэнтаў, як Музей дызайну і Галерэя Уінтан у Музеі навукі (першы спраектавала студыя Office of Metropolitan Architecture, другую — Zaha Hadid Architects), узялі рэванш над згаданым шпіталем Гай... Любы архітэктар, студэнт ці чалавек, які цікавіцца гэтай сферай, пацвердзіць — гэта адны з найлепшых і самых вядомых архітэктурных студый у свеце. Тое, што беларуская царква стала канчатковым пераможцам, — гэта нешта неймавернае. Прычым, як мне расказалі арганізатары конкурсу, наш праект перамог з вялікім адрывам ад канкурэнтаў. Шчыра скажу, дагэтуль не магу паверыць у гэты поспех. Магчыма, сэрцы людзей кранула гісторыя Беларусі, прыгажосць аўтэнтычных беларускіх цэркваў або гісторыя чарнобыльскай трагедыі... Я спадзяюся, што так.

***— Беларуская тэматыка застаецца для вас цікавай?***

***Ці пагадзіліся б яшчэ папрацаваць у гэтым кірунку, скажам, у Беларусі?***

— Безумоўна. Ваша краіна — бясконцая крыніца для натхнення, як увогуле ў мастацтве, так і непасрэдна ў архітэктуры. Таму, калі з'явіцца такая магчымасць, я без ваганняў пагаджуся спраектаваць што-небудзь звязанае з Беларуссю, а можа і ў самой Беларусі. Дарэчы, Мінск мае выдатную «калекцыю» мадэрнісцкай архітэктуры. Я лічу, што цэнтр беларускай сталіцы — гэта яшчэ адзін выдатны кандыдат на ўключэнне ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

***— Як па-вашаму, ці можа быць традыцыйная беларуская культура (і, у прыватнасці, архітэктура) цікавай для замежнікаў?***

— Беларуская архітэктура, як часоў Вялікага Княства Літоўскага, так і XIX стагоддзя, і нават савецкай эпохі, мае вялікую акадэмічную каштоўнасць. Захад па-ранейшаму не ведае яе значнасці, але гэту сітуацыю лёгка змяніць. Я думаю, патрабуецца толькі добры піяр. І мы ўжо шмат зрабілі ў гэтым кірунку. Так, напрыклад, часопіс Каралеўскага інстытута брытанскіх архітэктараў вельмі зацікавіўся спадчынай беларускіх драўляных цэркваў і даверыў мне напісанне артыкула на гэту тэму ў мінулым сакавіку. Мэтай была адукацыя іншых брытанскіх архітэктараў. У сваёй працы я сцвярджаю, што мы можам навучыцца вельмі многаму ў традыцыйнай беларускай архітэктуры. Наколькі мне вядома, гэта першы раз, калі Беларусь згадваецца ў гэтым прэстыжным часопісе з часу яго заснавання ў 1893 годзе. А з поспехам і прызнаннем, якія атрымала беларуская царква ў Лондане, мы зможам звярнуць увагу зацікаўленых архітэктурай людзей на культуру краіны. Як мінімум, калі цяпер нехта захоча паглядзець на найпрыгажэйшыя новыя будынкі Лондана, то ўбачыць у Google слова «Беларусь».



Увечары беларуская царква выглядае неймаверна прыгожа.





Замалёўкі, якія Со Цзыўай рабіў падчас падарожжа па Беларусі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by

Адкрытае акцыянернае таварыства

# «ДЗЯТЛАЎСКІ СЫРАРОБЧЫ ЗАВОД»

231471, Гродзенская вобласць, г. Дзятлава, вул. Кастрычніцкая, 105. E-mail: cheeseland@mail.ru. Тэл./факс (8 01563) 22-8-22



Прыёмшчыца малака Габайдуліна Е. В.



Інжынер-мікрабіёлаг Каско Л. К.



Апаратчык пастэрызацыі Шумская І. К.




Кіроўца аўтамабіля Шумскі С. І.



Участак канцэнтраванай сыроваткі.



Дракель Г. М., Гушча Н. М., Пузач С. А., Трапезарава Г. А.



Прыёмшчык малочнай прадукцыі Ванчук С. В.

УНП 500055917

## РУП «Институт недвижимости и оценки»
**извещает о повторном открытом аукционе со снижением цены по продаже здания магазина, Минская обл., Мядельский район, Нарочский с/с, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49А**

Лот №1. Двухэтажное здание магазина с инв. №633/С-2434. Назначение: здание специализированное иного назначения. Этажность – 2; Общая площадь – 106,00 кв. м. Фундамент – фундаментные блоки; Стены наружные и внутренние – блочные; Перегородки – дощатые; Перекрытия – деревянные утепленные; Крыша – шиферная; Полы – дощатые, плитка; Проемы оконные – двойные створчатые, металл. решетки; Проемы дверные – простые филенчатые; Наружная отделка – оштукатурено, облицовано кирпичом; Внутренняя отделка – обшито вагонкой, «сайдингом», оклейка обоями; Отопление – печное; Водопровод, канализация – есть; Электроснабжение – наружная проводка; Вентиляция – естественная.
**Начальная цена продажи — 39 150,00 бел. руб. Задаток - 3 910,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%.**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 624083309101000064, расположенный по адресу: Минская обл., Мядельский район, Нарочский с/с, аг. Нарочь, пл. 0,0237 га. Назначение — земельный участок для размещения объектов розничной торговли. На праве аренды, срок действия договора по 25.04.2100.

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Ипотека. В случае продажи с публичных торгов имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), — (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 08.09.2017 г. в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Здание магазина) (Лот №1), проводимом 08.09.2017 г.(Молодечненский МРО).
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 06.09.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Гординец Светлана Ивановна, 8 (017-97) 46-9-69. Пн.—пт. с 9.00 по 18.00, сб.—вс. с 10.00 по 18.00.

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 31 августа 2017 года на 11-м открытом аукционе проводит 10-й от 27 июля 2017 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 101 | ТЗ-22М (топливозаправщик) без тележки с/о А763353 на КрАЗ-258Б1 ш. 254200 дв. 373792- ЧМЗАП-5524П ш. 6725 дв. 084915 1976 г. *4 кат. 16 734 км 159,4 м/ч КР-1990 г.* | н.п. Михановичи в/ч 52188 | 16 400 | 1 640 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **31 августа 2017 г. в 11.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 28 августа 2017 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **31 августа 2017 г. с 9.00 до 9.45.**
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли — р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли — р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**
Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» №117 от 22 июня 2017 г.

**ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ, ЛИКВИДАТОР ООО «ПРОИЗВОДСТВЕННО-ТОРГОВАЯ КОМПАНИЯ «МАСТЕРВУД» – НИКИТИНА АЛЕСЯ ФЁДОРОВНА, действующая на основании Протокола внеочередного собрания участников ООО «ПТК «Мастервуд» от 03.06.2016 г., сообщает о проведении торгов по продаже имущества, а именно:**

Предмет торгов:

| № лота | Наименование лота | Кол-во, ед. | Начальная цена за 1 ед. лота в белорусских рублях | Шаг торгов 5% | Задаток 10% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автотранспортное средство Renaut Masscot. 2007 г.в., VIN VF354A-NA000037378 | 1 | 14898,0 | 744, | 1489,8 |
| 2 | Станок для шлифовки стекла GTC-011L | 1 | 1165,2 | 58,26 | 116,52 |
| 3 | Станок торцовочный 2-пильный мод. TR2ACE | 1 | 11 533,2 | 576,66 | 1153,32 |
| 4 | Станок универсальный фрезерный FUS-22 | 1 | 5377,2 | 268,86 | 537,72 |
| 5 | Станок форматно-раскроечный круглопил. мод. Actra400CE | 1 | 15 233,4 | 716,67 | 1523,34 |
| 6 | Пылесос CTL26E | 2 | 360,6 | 18,03 | 36,06 |
| 7 | Кромкооблицовочный станок BRANDT Optimal KTD 72 | 1 | 2436,0 | 121,8 | 243,6 |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.
До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичной форме по следующим платежным реквизитам: ООО «ПТК «Мастервуд» р/с BY21ALFA30122127170070270000 в ЗАО «Альфа-банк» ALFABY2X, УНП 191605354.
Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 05 августа 2017 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом. 46, офис 5.
Окончание приема заявок на участие в торгах прекращается за 2 дня до даты, на которую назначено проведение торгов.
Задаток должен поступить на указанный счет Продавца не позднее 5 августа 2017 года.
Торги состоятся 7 августа 2017 в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом 46, офис 5.
Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.
Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом 46, офис 5. Тел.: (029) 645 19 47

## РУП «Институт недвижимости и оценки»
**извещает о повторном открытом аукционе со снижением цены по продаже здания магазина, Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Сухая, д. 89**

Лот №1. Здание неотапливаемого склада с инв. №630/С-46863. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Этажность – 1; Общая площадь – 1 612,00 кв. м. Фундамент – бетонный; Стены наружные и внутренние – кирпичные, крупнопанельные; Перегородки – кирпичные; Перекрытия – ж/бетонные; Крыша – рулонная; Полы – бетонные; Проемы оконные – глухие окрашенные; Проемы дверные – металлические ворота; Наружная отделка – расшивка швов; Внутренняя отделка – стены оштукатурены; Электроснабжение – открытая проводка; Вентиляция – принудительная.
**Начальная цена продажи — 296 228,25 бел. руб. Задаток — 29 620,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%.**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 642000000001000776, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Сухая, д. 89, пл. 5,3062 га. Назначение — земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности для строительства и обслуживания производственной базы. На праве постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Аренда части здания (778,10 кв. м) до 30.08.2020

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 11.09.2017 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Назначение платежа: задаток для участия в открытом аукционе по продаже имущества (Здание склада) (Лот №1), проводимом 11.09.2017 (Молодечненский МРО).
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 07.09.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: нач. цеха ОАО «ПМК-32» Наркевич Андрей Валентинович +375-33-381-80-95

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

## Предложение о покупке акций ОАО «Группа компаний «Полесьежилстрой»

Полное наименование и место нахождения юридического лица покупателя акций: Открытое акционерное общество «Группа компаний «Полесьежилстрой», Республика Беларусь, 224001 г. Брест, ул. Кижеватова, 60, к. 8, телефон 8 0162 57-33-57.

Полное наименование, место нахождения открытого акционерного общества, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество «Группа компаний «Полесьежилстрой», Республика Беларусь, 224001 г. Брест, ул. Кижеватова, 60, к. 8.

Простые (обыкновенные) акции приобретаются с целью аннулирования и уменьшения уставного фонда.

Количество простых (обыкновенных) акций, которые намеревается приобрести покупатель: до 200 000 (Двести тысяч) штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобрести простые (обыкновенные) акции: 2,70 белорусских рублей (Два белорусских рубля 70 копеек) за одну акцию.

Порядок и форма расчетов: выкуп простых (обыкновенных) акций производится с оформлением сделок купли-продажи пропорционально поданным заявлениям. Оплата приобретенных акций производится не позднее 12 (Двенадцати) месяцев с момента заключения договора купли-продажи. Форма оплаты: путем безналичного расчета.

Адрес, по которому будут заключаться договора купли-продажи акций: Республика Беларусь, г. Брест, ул. Кижеватова, 60, к. 8, время работы с 8.00 до 17.00, обед с 12.00 до 13.00 в будние дни, выходной – суббота, воскресенье.

Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи): срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, – с 10.08.2017 по 20.08.2017. Срок, в течение которого осуществляется совершение сделок купли-продажи акций, – с 21.08.2017 по 31.08.2017.

УНП 291082287

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 7 сентября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Склад ОД №6» общей площадью 233,3 кв. м, инв. номер 130/С-25621 (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) |
| **Местонахождение** | Брестская область, г. Пинск, ул. Брестская, 137Г |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,2258 га, кадастровый номер 144500000022000466, целевое назначение – для обслуживания здания склада ОД №6 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца, 121А, к. 327 |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 34 400,00 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 3 400,00 белорусских рублей |
| **Условие торгов** | победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: пятьдесят процентов от стоимости имущества оплачиваются в течение 5 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи, оставшиеся пятьдесят процентов – в течение 30 дней со дня подписания договора купли-продажи.

Торги проводятся 7 сентября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 31.07.2017 по 05.09.2017 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(0165) 34-77-91, (029) 130-37-26 (ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», филиал «Камертон»).**



Фота Тараса ТАРНАЛІЦКАГА.

Падзея месяца

# АБНУЛЕННЕ ЯК МЕТАД

## Наватарства і архаіка спалучыліся дзеля стварэння кіно

**У вёску Каптаруны на самай мяжы з Літвой, дзе адбыўся Міжнародны форум памежнага кіно «ХРОНОТОПЬ. ART: REBOOT», я паехала па канцэпцыю «хранатопі» Андрэя Кудзіненкі і тэорыю наконт будучыні беларускага кіно, а вярнулася з надзеяй, што мясцовыя багі знайшлі маю душу дастаткова светлай, каб забяспечыць мне вецер перамен. Форум, дзе кіношнікі агучваюць перадавыя ідэі і пасля здымаюць кіно па «новай тэхналогіі», дзіўна спалучаецца з архаічным месцам правядзення, дзе да гэтых часоў адгукаецца паганства. Каптаруны — «край зямлі», з асаблівым мінулым, уласнай міфалогіяй і невытлумачальнай магіяй. Чалавек тут — не гаспадар, а толькі госць, над якім уладараць невядомыя сілы. Над праграмай форуму яны, дарэчы, таксама ўладарылі і прыўносілі ў стройныя планы пэўны хаос. Але, як вядома са старажытнагрэчаскай міфалогіі, «вечны, безгранічны, цёмны Хаос» — гэта крыніца жыцця свету. Усё ўзнікла з Хаосу, а што ён спарадзіў на гэты раз, праз некаторы час мы ўбачым у чарговым кінаальманаху «Хранатоп».**

Лекцыі, кінапрагляды, дыскусіі, перформанс і канцэрт, прызначаныя выбіць удзельнікаў са звыклага рытму жыцця, прыйшліся на выхадныя 22 і 23 ліпеня (па вечарах самаарганізоўваліся песні пад гітару каля вогнішча). З панядзелка ж распачаўся пяцідзённы кіналагер і ўласна стварэнне кіно па методыцы Андрэя Кудзіненкі, гісторыя якога, напэўна, пачынаецца з яго першага альманаха «Хранатоп», які атрымаў гран-пры праграмы «Омнібус» на кінафестывалі краін СНД і Балтыі «Кінашок».

З тых часоў з'явілася яшчэ некалькі хранатопаўскіх альманахаў. Яны ствараліся ў тым ліку падчас так званых акцый, дзе пад кураторствам рэжысёра ўдзельнікі «абнуляліся», самаарганізоўваліся і за кароткі тэрмін выдавалі вынік. Ужо хутка было прыдумана зрабіць месцам дыслакацыі вёску Каптаруны, дзе чатыры гады таму мастак і пісьменнік Артур Клінаў набыў дом, пачаў яго рэстаўрыраваць і вырашыў, што Каптаруны могуць стаць месцам для масавых імпрэз, праектаў і фестываляў. Ідэя, якая, дарэчы, іграе становучую ролю ў дэцэнтралізацыі культуры краіны, добра спалучылася з канцэпцыяй Андрэя Кудзіненкі, дзе галоўнымі паняццямі з'яўляюцца хранатопь, памежжа і абнуленне. Так, з часам вёска стала называцца арт-вёскай, а наваколле аказалася месцам для кінафоруму і кіналетніка. Адноўленыя дамы, магія месца і памежжа з Літвой упершыню заігралі ў беларускай кінасферы ў мінулым годзе, калі адбыўся першы арт-фэст «Хранатопь», дзе былі створаныя такія работы, як, напрыклад, «Вянок» Павала Нядзведзя і «Адамаў яблык» Алены Ясінскай.

**Каптаруны становяцца ідэальнай лакацыяй для ідэі абнулення, бо гэтаму садзейнічае ўжо згаданая магічная энергетыка месца (калі яна не існуе, яе варта выдумаць).**

Хранатопь — гэта аўтарскі неалагізм Андрэя Кудзіненкі (які паходзіць ад «хранатопа» Міхаіла Бахціна), які азначае патанулы ў балоце час, пераходныя стадыю і асяроддзе, калі чалавек памірае ў адным статусе, каб нарадзіцца ў іншым. Рэжысёр лічыць, што ў хранатопі цяпер знаходзіцца ўвесь свет і наша краіна ў прыватнасці. Кінематаграфісты, якія здымаюць фільмы па методыцы Кудзіненкі, таксама павінны пабываць у гэтым пераходным стане, у хранатопі з добрай канатацыяй, каб прыйсці да нейкага нечаканага выніку. Наватарскі спосаб здымаць кіно Андрэя Кудзіненкі — падкрэсліваю, што гэта не работа з жанрам, стылем, мовай кіно, а менавіта метад стварэння фільмаў, — з'явіўся якраз у перыяд, калі ў хранатопі загразнуў беларускі кінематограф. Калі кіно за дзяржаўныя грошы не дае належнага выніку і незалежнае не ўяўляецца сілай, бо для развіцця яму не стае хоць бы наладжанай кінаіндустрыі. Тут выступае Андрэй Кудзіненка і кажа, што фільмы можна здымаць, не знаходзячыся ні ў той, ні ў другой сістэме, а новым спосабам, якому не патрэбны пітчынгі, конкурсы кінапраектаў і вялікія бюджэты. З'яўленне кудзіненкаўскай канцэпцыі ў беларускай кінасферы ўвогуле сімптаматычнае. Дарэчы, наколькі яе наватарства кантрастуе з архаічнымі мясцінамі вакол Каптарун, настолькі ж з імі карэлюе яе сэнс. Ідэя памежжа ў кіно звязваецца з тэрытарыяльным памежжам. Ідэя хранатопі ў яе сувязі з багнай увасабляецца ў рэальным балоце. Каптаруны становяцца ідэальнай лакацыяй і для ідэі абнулення, бо гэтаму садзейнічае ўжо згаданая магічная энергетыка месца (калі яна не існуе, яе варта выдумаць). У хранатопі, згодна з Кудзіненкам, змываюцца катэгорыі — «тут можа быць рэальны свет, незямны і бессвядомы» — Каптаруны і гэтаму садзейнічаюць, бо мабільная сувязь адсутнічае для кожнага і вада возера для ўсіх густая аднолькава.

Дарэчы, гэтая тэрыторыя з'яўляецца месцам дзеяння аповесці Праспера Мерымэ «Локіс», па якой Андрэй Кудзіненка ў 2010 годзе на «Беларусьфільме» зняў свой містычны трылер «Масакра». Палотны з фільма цяпер вісяць у каптарунскім доме Артура Клінава, які быў на «Масакры» мастаком-пастаноўшчыкам. У гэтых жа мясцінах праз некалькі гадоў рэжысёр здымаў фільм Hard Reboot.

**Адноўленыя дамы, магія месца і памежжа з Літвой упершыню заігралі ў беларускай кінасферы ў мінулым годзе, калі адбыўся першы арт-фэст «Хранатопь».**

Сёння ж людзі з абсалютна розных сфер прыязджаюць сюды, каб пад куратарствам кінематаграфістаў абнуліцца, аб'яднацца ў групы і зняць кіно. Апроч Андрэя Кудзіненкі сёлета куратарамі былі дырэктар кінашколы Андрэй Палупанаў і расійскі рэжысёр незалежнага кіно, заснавальнік Лігі эксперыментальнага кіно і прэзідэнт Канскага фестывалю (у расійскім горадзе Канск) Андрэй Сільверстаў. Месцам дзеяння — «старажытны цэнтр паганскай культуры» з асаблівай энергетыкай (дзе становучай, дзе адмоўнай) і магічным возерам. Альтэрнатыўнае выйсце для беларускага кінематографа мусіць быць апрабаваным чарговы раз. Можа, гэта сапраўды — выйсце?

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Прэзентацыя

# ФОРМУЛА ШЧЫРАСЦІ АЛЯКСАНДРА ЛАКОТКІ

## Акадэмік прадставіў альбом мастацкіх твораў

**Спалучэнне ў адной асобе рыс строгага даследчыка, акадэмічнага супрацоўніка і чуллівай душы мастака падаецца на першы погляд немагчымым. Але ж нездарма з'явілася знакамітае выслоўе: таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім. Вось і Аляксандр Лакотка, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гісторыі, доктар архітэктуры, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН, чарговы раз даказаў яго слушнасць — сваім уласным прыкладам. Днямі ў сталічным магазіне «Кнігі & кніжачкі» сеткі «Белкніга» прайшла прэзентацыя аго альбома «Прастор родны. Беларусь». Выданне, што на сваіх старонках прадстаўляе графічныя і жывапісныя работы Аляксандра Іванавіча, над якімі ён працаваў каля чатырох дзесяцігоддзяў, пабачыла свет у выдавецтве «Бяловагруп».**





Фота Кастуся ДРОБАВА.

— З'яўленне гэтай кнігі не выпадковае. Тут ёсць прысвячэнне майму бацьку. Я вырас у сям'і сельскіх настаўнікаў, маці выкладала беларускую мову і літаратуру, а бацька — нямецкую мову і гісторыю. Апроч гэтага, мой тата быў мастаком-самародкам: аздабляў сцэны, маляваў тэатральныя дэкарацыі, пісаў пейзажы. Я таксама марыў пра кар'еру мастака, але лёс склаўся так, што абраў прафесію архітэктара, — расказвае **Аляксандр ЛАКОТКА**. — Але ж, як вядома, архітэктура, жывапіс, графіка — родныя. І з часоў навучання ў БНТУ я не пераставаў займацца жывапісам, малюнкам. З захапленнем пісаў у Маскве, Санкт-Пецярбургу, іншых гарадах. Працаваў з вядомым дойлідам Георгіем Заборскім, вялікім майстрам малявання.

Аляксандр Іванавіч удзельнічаў у стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, тады падчас даследчых экспедыцый праехаў тысячы кіламетраў па Беларусі. Вандруючы, натхняўся пейзажамі, народным побытам. Таму на яго мастацкіх работах адбілася філасофія прыроды, яе паяднанне з міфалогіяй, жыццём простага беларуса.

— У маёй дамашняй бібліятэцы ўжо назбіралася цэлая паліца кніг Аляксандра Лакоткі. Сёння мы знаёмімся з нечаканым выданнем. Яно здзіўляе не толькі тым, што акадэмік тут выяўляе сябе як мастака, але і фарматам у цэлым, аб'яднаннем усіх талентаў, зацікаўленняў Аляксандра Іванавіча, — кажа **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**. — Тут ёсць цеплыня, чалавечы, навуковы, творчы лёс. З асаблівай шчымлівасцю чытаюцца старонкі расказу, як аўтар далучыўся да выяўленчага мастацтва. Спадзяюся, што следам за прэзентацыяй кнігі адбудзецца і выстаўка работ Аляксандра Лакоткі.

З прыхільнасцю да жывапісных і графічных работ акадэміка паставіліся і строгія мастацтвазнаўцы.

— Старонкі альбома дзіўным чынам перадаюць атмасферу шчырасці, якую адчуваеш пры знаёмстве з работамі Аляксандра Лакоткі. Акадэмік, сур'ёзны даследчык тут выяўляе сябе сапраўдным мастаком, творцам нечаканым, — дадае **дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, мастацтвазнаўца Наталля ШАРАНГОВІЧ**. — Мне падаецца, якім бы ні было мастацтва, самае галоўнае ў ім — формула шчырасці, дыялог з гледачом. Гэтыя рысы ёсць у работах Аляксандра Іванавіча — у колеры, тэматыцы, уменні схапіць сутнасць беларускай прыроды, адметнасці нашай нацыі. Тут згадваюцца творы Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Віталя Цвіркі, тых людзей, якія шчыра выказвалі свае адносіны да мастацтва і народа.

Сам аўтар прызнаўся, што, рыхтуючы да выдання альбом «Прастор родны. Беларусь», вельмі хваляваўся: гэта ж па сутнасці першы выхад да шырокай публікі ў якасці мастака. І яго прынялі з цеплынёй. Але спадзяёмся, што за знаёмствам нас чакаюць і новыя сустрэчы, і адной з наступных стане персанальная выстаўка ■

■ Фотафакт

# ПРОМНІ СОНЦА — НА ФОТАЗДЫМКАХ



Фота БЕЛТА.

Гэтым летам надвор'е не надта песціць беларусаў цеплынёй ды яркім сонейкам. Але экспазіцыя «Летні настрой», арганізаваная БЕЛТА сумесна з адміністрацыяй Цэнтральнага раёна сталіцы ў гандлёва-забаўляльным цэнтры Galleria Minsk, безумоўна, уздыме настрой гараджанам і гасцям.

Выстаўка складзена з чатырох дзясяткаў работ, выкананых фотамастакамі — супрацоўнікамі БЕЛТА. Тут можна пабачыць згадкі з яркіх падзей жыцця краіны, маляўнічыя пейзажы і партрэты беларусаў.

Кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы Ігар Бузоўскі лічыць, што ідэя выстаўкі «Летні настрой» вартая падтрымкі і праект будзе працягвацца і пашырацца.

Яго думку падчас адкрыцця выстаўкі падтрымаў генеральны дырэктар Беларускага тэлеграфнага агенцтва Дзмітрый Жук. Дзмітрый Аляксандравіч таксама дадаў, што экспазіцыя будзе рэгулярна папаўняцца цікавымі і запамінальнымі работамі, а да дня горада яна будзе абноўленая ■

■ Машына часу

# У ГОСЦІ ДА КАПЛАНА

## Здзейсніць вандроўку ў мястэчка пачатку XX стагоддзя прапануе новая выстаўка Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

Імя Анатоля Каплана, мастака, графіка, які нарадзіўся 115 гадоў таму ў Рагачове, вядомае далёка не кожнаму беларусу. Да нас толькі пачынае вяртацца яго творчая спадчына. А між іншым работы майстра захоўваюцца ў найбуйнейшых музеях і галерэях свету, выстаўкі іх з поспехам праходзілі на самых прэстыжных пляцоўках. Калекцыя графікі Анатоля Каплана ёсць і ў нашым Нацыянальным мастацкім музеі, а таксама на яго радзіме, у Рагачоўскім музеі народнай славы.

Гульня святла і ценю. Неверагодная фактурнасць. Дробныя дэталі, замалёўкі, якія разам з тым перадаюць манументальнасць задумкі аўтара. Так коратка можна апісаць работы, прадстаўленыя ў межах выстаўкі «Краіна мястэчак Анатоля Каплана». Экспазіцыя створана Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Рагачоўскім Дзяржаўным музеем народнай славы, сталічнай аптэкай №88, Музеем гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі. Тут можна пабачыць не толькі графіку, але і завітаць у аптэку пачатку XX стагоддзя, зайсці ў гасцёўню дома, дзе жывуць яўрэі, паслухаць музыку, пабачыць кнігі нашых пісьменнікаў, якія ў сваіх творах распавядалі пра жыццё мястэчак. Дарчы, на адкрыцці выстаўкі з Мурманска завітаў нашчадак Анатоля Каплана Віктар Аляксандраў.

**Мастацтвазнаўца, калекцыянер, мецэнат Ісак КУШНІР** з Санкт-Пецярбурга, які валодае самай вялікай у свеце калекцыяй работ Анатоля Каплана, расказаў:

— Ён скончыў Ленінградскую акадэмію мастацтваў, але 27 гадоў працаваў у галіне прамысловай графікі. У 1937 годзе трапіў да выдатнага педагога, графіка Георгія Вярэйскага. І толькі тады зразумеў, чым павінен займацца па жыцці. За гэтыя гады Анатоль Каплан зрабіў сапраўды шмат, пакінуў вялікую творчую спадчыну, якая здабыла сусветную вядомасць. Гэта сотні малюнкаў, афортаў, графічных лістоў, запісныя кніжкі. Я шчодра дзялюся прадметамі са сваёй калекцыі з музеямі, у тым ліку Рагачоўскім музеем народнай славы, а таксама Рагачоўскай мастацкай школай.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Творчы лёс Анатоля Каплана вельмі складаны. Яўрэі шмат стагоддзяў жылі ў рассяленні. Але ў кожнай краіне лад іх жыцця і супольнасць складваліся па-свойму. Магчыма, толькі ў Беларусі культура яўрэяў выявілася ў адметнасцях местачковага ладу жыцця, — дадае **мастацтвазнаўца Ларыса ФІНКЕЛЬШТЭЙН**. — Жыццёвыя выпрабаванні, радасці, адметнасці побыту знайшлі адлюстраванне ў творчасці Анатоля Каплана. Ён вельмі цікавы рысавальшчык. Да гэтых работ можна прыглядацца бясконца. Яны зацягваюць у сваю рэчаіснасць, можна не адразу считаць не толькі сюжэт, але і тую філасофію, роздум, мудрасць, што ёсць у самога мастака і яго твораў. Яго работы — своеасаблівыя помнікі часу, яго суайчыннікам і суседзям.

Падчас адкрыцця выстаўкі прагучала ідэя стварыць у Рагачове, на радзіме нашага выдатнага земляка, музей Анатоля Каплана, каб і госці горада, і мясцовыя жыхары мелі магчымасць, завітаўшы ў яго, даведацца больш пра жыццё і творчасць выдатнага майстра. Таксама плануецца, што ў горадзе з'явіцца бронзавая скульптура мастака ■

Матэрыялы паласы падрыхтавала Марына ВЕСЯЛУХА. vesialuha@zviazda.by

■ Вернісаж

# Мастацкі космас Аляксея і Анастасіі Урублеўскіх

## Новая выстаўка творцаў «Каляровыя сны» адкрылася ў арт-гасцёўні «Высокае места»

**Ці задумваліся вы калі-небудзь, што хаваюць сны і як яны ўплываюць на рэальнае жыццё чалавека? Псіхолагі кажуць, што сны — гэта нашы жаданні і ўнутраныя перажыванні альбо чароўныя мары, якія не даюць спакою. Беларускія мастакі Аляксей і Анастасія УРУБЛЕЎСКІЯ захоўваюць свае сны ў мастацкіх творах.**



Аляксей Урублеўскі, «Мелодыя», 2014 г.

Большасць людзей бачаць чорна-белыя сны, а часам так хочацца каляровых! Маладыя мастакі ўвасобілі вобразы ўнутранага свету ў жывапісе і скульптуры, дадалі да іх колеру і аб'ёму, тым самым ператварыўшы свае сны ў цікавую гісторыю.

— Выстаўка «Каляровыя сны» дэманструе ўласцівы мастакам стан гармоніі і дабрыні, — падкрэсліла на адкрыцці праекта **дырэктар Музея гісторыі горада Мінска Галіна ЛАДЗІСАВА.** — Унутраны падсвядомы свет мастака развіты больш, чым у звычайнага чалавека, а калі гэта сям'я мастакоў — яшчэ больш высокі ўзровень адчувальнасці. Мы ведаем шмат сем'яў артыстаў, музыкаў, якія злучаюцца разам. Сем'і мастакоў — асобная катэгорыя: гэтыя людзі павінны ўмець прымаць творчасць адно аднаго. Вельмі цікава, калі кожны член сям'і захапляецца асобным жанрам мастацтва, гэта вучыць іх больш глыбока акунацца ў працэс, іх злучаюць агульныя эмоцыі. Так атрымалася і ў творчасці Аляксея і Анастасіі, яны гарманічныя і яркія, іх творчасць натхнёная, насычаная глыбокімі філасофскімі думкамі. У свеце мастацтва няпроста, таму гэтыя творцы імкнуцца падтрымаць адно аднаго. Калі ёсць плячо, паразуменне і парада, мастакам лягчэй, яны ведаюць, што іх творчасць не засталася па-за ўвагай, што яна цэніцца любімым чалавекам.

Аляксей і Анастасія Урублеўскія жывуць і працуюць у Лідзе, там жа і развіваюць мастацкае жыццё. Іх выстаўкі перыядычна адкрываюцца ў розных гарадах Беларусі, таму недахопу ўвагі да ўласнай творчасці мастакі не адчуваюць. Абодвум аўтарам падабаюцца тэмы кахання і чалавечай сілы. Што цікава, мастакі не паўтараюцца, у кожнага сваё разуменне чалавечых адносін. Можна нават сказаць, што ў творчасці Аляксей і Анастасія дапаўняюць адно аднаго, але самі яны падкрэсліваюць, што робяць гэта не спецыяльна.

— Мы наогул ніколі не задумваемся, што мы сям'я мастакоў, мы ў першую чаргу проста сям'я, — адзначае Аляксей Урублеўскі. — Ведаем, што ёсць праблема суіснавання творчых людзей, але тут трэба зрабіць выбар — будзеш ты падтрымліваць любімага чалавека альбо канкураваць з ім. Мы зрабілі выбар даўно. Я і Насця па-свойму касманаўты, у нас у кожнага асабісты творчы свет, у якім мы не перасякаемся, таму што я займаюся скульптурай, а яна жывапісам. Я часам бяруся за пэндзаль, але Насця не вучыць мяне, як правільна. Яна можа даць параду, падтрымаць, нават імкнецца мяне матываваць развівацца шматгранна ў мастацтве. Хоць крытыка каштоўная ў разумных маштабах, але мы неяк больш радуемся поспехам адно аднаго. Я не хачу спаборнічаць, бо спаборніцтва ў сям'і не прывядзе да добрага. У кожнага з нас ёсць патэнцыял і ўласныя мэты, якія не з'яўляюцца шкодай для сям'і.

Мастакоў аб'яднала творчасць, менавіта яна стала першым крокам да кахання і павагі. Цяпер жа каханне натхняе аўтараў і падштурхоўвае развівацца ў мастацтве, атрымліваць ад яго асалоду.

**Вікторыя АСКЕРА.**



Анастасія Урублеўская, «Наста», 2013 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***Свой шлях на літаратурны Алімп Таццяна пачынала з вершаў. Дарэчы, на працягу многіх дзесяцігоддзяў гэта быў бадай самы праверaны шлях для беларускіх (дый, зразумела, не толькі беларускіх) аўтарак. Пасля яна звярнулася да крытыкі — галіны творчай дзейнасці, якая доўгі час з'яўлялася прывілеяй мужчын, хоць дваццаць першае стагоддзе, здаецца, ужо вельмі доказна пераконвае ў адваротным. Але ці не самым нечаканым крокам Таццяны быў зварот да жанру пародыі: нават не згадаю адразу, ці былі ў яе папярэдніцы. Апошнім часам яна ўсё часцей піша прозу, папоўнішы шэрагі нашых мілых і, бясспрэчна, таленавітых пісьменніц, уласнай творчасцю гатовых даказаць, што іранічна ды паблажліва гаварыць пра жаночую прозу могуць толькі калегі-зайздроснікі — вядома ж, мужчыны.***

**Алесь БАДАК.**

### ТАЦЦЯНА БУДОВІЧ-БАРАДУЛЯ

# РЫТУАЛ

НА афішы значыўся яго ўлюбёны кампазітар, таму я дакладна ведала, што Артур будзе на прэм'еры. Хаця не толькі гэта сталася нагодай пайсці ў філармонію. Раз ці два на месяц я праробліваю рытуал: адводжу малую да мамы, адзяваю вячэрнюю сукенку, срэбныя завушніцы з каменьчыкамі, абавязкова — абцасы і абсалютна адна іду паглядзець альбо паслухаць нешта цікавае. Адразу кудысьці сплываюць праблемы, час запавольваецца. Мяне атачае іншая рэальнасць, абступаюць паралельныя сусветы, і гэта дае сілы і натхненне на ўласнае жыццё.

Тым вечарам я ішла слухаць класічныя творы ў сучаснай аранжыроўцы. Як і заўжды на такіх мерапрыемствах, настрой быў прыўзняты; мяне нікольki не турбавала, што я шпацыравала без ніякай кампаніі, у адрозненне ад астатніх аматараў музыкі. Да пачатку заставалася паўгадзіны. Элегантна апранутыя парачкі нягучна перамаўляліся, разглядаючы карціны на сценах залаў, прахоўдваліся па галерэях, фатаграфаваліся ў раскошных фатэлях.

Я ўбачыла яго са спіны. Але... майму здзіўленню і роспачы не было меж: Артур трымаў пад ручку бялявую стройную даму. За імі слаўся лёгкі шлейф дарагой парфумы. На мяне быццам абрынулі цэбар ледзяной вады. Захацелася ўціснуцца ў сцяну паміж карцінамі, зліцца з ёю, стаць нябачнай, бязважкай, імгненна дэматэрыялізавацца, распасціся на атамы... Мільганула думка: а раптам гэта ўсё ж не ён, а хтосьці вельмі падобны — такі ж хударлявы, высокі, цёмнавалосы... Але якраз у гэты міг ён крыху павярнуў галаву і нешта ціха прамовіў у вушка сваёй спадарожніцы, дакранаючыся вуснамі да яе завітых локанаў. Той самы тонкі (адзіны ў свеце!) непаўторны профіль...

НА ватных нагах я знайшла свой рад і месца. І толькі потым зразумела, што лепш было б адразу пайсці дадому. Я нічога больш не хацела: ні музыкі, ні ўрачыстага чакання, ні бачыць гэтых шчаслівых людзей з іх усмешкамі. Толькі залезці ў самую глыбокую нару і ад усіх схавацца... Але партэр стаў хутка запаўняцца гледачамі, яны знаходзілі свае месцы, дзелавіта разгортвалі праграмкі, абмяркоўвалі пазначанае ў іх. Крэслы справа і злева ад мяне адначасова аказаліся занятымі. Нечакана за два рады перада мною з'явіліся Артур і яго спадарожніца. Сыходзіць было позна...

Палілася музыка. Яе плынь накрыла мяне, ухутала, абгарнула пяшчотай і разуменнем. Кропля ў сусветным акіяне жыцця сярод такіх самых кропель, разам з цячэннем я імкнулася насустрач Богу, абсалютну, самой сабе, такой, якою была задумана Кімсьці Вышэйшым...

Ну і што, што Артур не адзін? Хіба ён не мае права на простае чалавечае шчасце? Хіба ён не заслужыў яго гадамі самаахвярнай працы і аскетычным ладам жыцця? Што з таго, што сваё шчасце ён знайшоў не са мною?..

УСЕ мінулыя гады, поўныя выпрабаванняў на трываласць, ён і так адчуваўся побач, нябачна прысутнічаў паўсюль. Неўзабаве пасля нараджэння дачкі выявілася, што ў яе хворае сэрца. Патрабавалася тэрміновая медыцынская дапамога, некалькі аперацый. І ўсё адно ўрачы нічога не гарантавалі. Нечаканасць агаломшыла мяне, пазбавіла сіл і жадання жыць. У перапынках паміж паходамі да чарговага доктара я ляжала ў ложку і літаральна не магла падняцца. Дэпрэсія — як запой: у абодвух выпадках чалавек страчаны для соцыуму. Я сутыкнулася з татальным непаразуменнем, поўным агрэсіі, пагарды, нават нянавісці; не адзін раз стаяла на мяжы... Узнікалі думкі аб марнасці ўсялякіх высілкаў, бессэнсоўнасці таго, што адбываецца. Ад самага блізкага чалавека, які кляўся перад Богам дзяліць усе нягоды, ішлі толькі папрокі. Ён учыняў скандалы на роўным месцы... Часам здавалася, што мы жывём у розных вымярэннях, і толькі калі яны выпадкова накладаюцца адно на адное, адбываецца нешта накшталт кароткага замыкання і вызваляецца воблака чорнай, разбуральнай энергіі... Я моўчкі назірала, як ён крычаў, біў з размаху мэблю, грукаў у сцены, і думала сама сабе: ну, пабі мяне, калі ласка, — будзе нагода падаць заяву на развод. Не так проста пазбавіць дзіця бацькі, які б ён ні быў...

Але нагода не спатрэбілася. Прыраўнаваўшы мяне да даўняга сябра, з якім я зрэдку па тэлефоне абмяркоўвала прачытаныя кнігі ды прагледжаныя фільмы, ён хутка сабраў рэчы, ляпнуў дзвярыма, сеў у аўто і з'ехаў да каханкі, якую не так даўно займеў...

ПАДАВАЛАСЯ, у мяне натуральна з'язджае дах. Адночы, не ўсведамляючы, што я раблю, бязмэтна некуды ішла (малая засталася дома пад наглядам бабулі). На супрацьлеглым баку вуліцы ўбачыла аптэку і падумала, што варта было б набыць хоць якіх вітамінаў, каб менш нервавацца і пазбавіцца заўсёднага пачуцця трывожнасці. Так і рушыла цераз дарогу, нават не зірнуўшы налева ці направа... Не ведаю, чым бы ўсё скончылася, але за спінай пачула рэзкі, гучны кліч: «Таша!!!» Гэта быў голас Артура, які я пазнала б заўжды! У той самы міг я спынілася, а міма на вялікай хуткасці пранеслася маршрутка. Вуліца за мною была пустая...

А ў самыя цяжкія моманты ён мне сніўся. Так, у лякарні, перад аперацыямі, што мусілі рабіць дачушцы, ён прыходзіў і сядаў побач. Моўчкі браў маю руку. Прачнуўшыся, яшчэ доўга я адчувала цяпло яго далоняў. І кожны раз ведала: усё будзе добра.

КАЛІ малая крыху ачуняла, нас выпісалі дадому. Мне вельмі хацелася пабачыцца з Артурам ці проста пазваніць яму. Але не засталося нават нумара яго тэлефона, а агульных знаёмых не было. І тады я стала разважаць аб прычыне маёй прывязанасці да яго. Яна ўзнікла абсалютна без ніякіх падстаў, без ніякіх захадаў з яго боку. Я прыйшла да высновы, што псіхіка — вельмі хітры механізм. Ён «выцягнуў» з мінулага асобу, з якой звязаныя толькі станоўчыя моманты біяграфіі, і штучна стварыў неўратычную залежнасць, «пракручваючы» ў галаве ўсе нашы сустрэчы, гутаркі, жарты — ярка, як наноў размаляваныя. Мне было тое патрэбна — інакш я, напэўна, альбо звар'яцела б, альбо... (Я перастала ўнутрана асуджаць тых мацярок, якія разам з дзецьмі выкідваюцца з вокнаў, не атрымаўшы простай чалавечай спагады альбо добрага слова ў цяжкую часіну.) У самыя трывожныя ночы механізм «падсоўваў» мне тое, чаго найбольш бракавала, — «сонныя таблеткі», у якіх актыўным рэчывам з'яўлялася разуменне — чаго я не мела ў штодзённым жыцці. Я змірылася, бо галоўным было выцягнуць малую з яе хваробы. І свет падзяліўся на два полюсы: на адным былі тыя, хто хоць неяк мне дапамагаў і падтрымліваў па-над безданню — іх можна было пералічыць па пальцах рукі, а на другім — усе астатнія, якія, наадварот, штурхалі мяне туды.

ПРАЗ год мы леглі ў шпіталь на чарговае абследаванне. Вынікі аказаліся станоўчымі, дынаміка — добрай. Жыццю дачкі нічога больш не пагражала. Як жа мне не ставала Артура, каб раздзяліць з ім радасць перамогі! Якая наўрад ці была б магчымай без яго...

І вось — ён сядзіць за два рады перада мной са сваёй мілай спадарожніцай, часам яны перашэптваюцца, усміхаюцца. Слёзы бязгучна каціліся з вачэй, але мне ўжо не было ні маркотна, ні сумна — хай усё будзе так, як наканавана, хай ён будзе шчаслівы! Хто ж, як не ён, варты таго!

Калі дырыжор пакланіўся і прадставіў музыкаў з аркестра, я, перапрашаючы, хутка пакінула сваё месца і пайшла да выхаду.

У гардэробе яшчэ нікога не было. Я ўзяла паліто і апранулася. Павярнуўшыся, так і застыла: за метр ад мяне стаялі Артур і яго жанчына. Ён пазнаў мяне, усміхнуўся, падышоў бліжэй:

— Таша! Якая сустрэча! Колькі гадоў мінула, а вы па-ранейшаму цудоўна выглядаеце — такая ж юная і прыгожая! Дарэчы, пазнаёмцеся! Мая пляменніца Ірэна! Ірэна, гэта Таша, найлепшая мая вучаніца, адна з самых здольных, талент ад Бога!

Ірэна прыязна кіўнула галавой:

— Вельмі прыемна!

Я глядзела на яго, на яе і нічога не разумела, не ў стане вымавіць слова ці хаця б усміхнуцца ў адказ. Дык, значыць, пляменніца... Маладзейшая за яго, такая вытанчаная, элегантная, апранутая з густам.

— Таша, што з вамі? Вы хоць пазналі мяне? Цэлыя два гады мы развучвалі гамы, санаты, эцюды, элегіі, а цяпер вы нібы ўпершыню мяне бачыце! Як, між іншым, здароўе вашай дачушкі?

— Дзякуй, добра! — урэшце, знайшла што адказаць. Як ні дзіўна, але толькі прагучаў упэўнена, быццам падобныя сітуацыі здараюцца са мною штодзённа: я выпадкова сустракаю чалавека з роднаснай душой... Нябачная прысутнасць якога ўратавала мяне з самай беспрасветнай невараці.

— Дарэчы, Ірэна, а чаму б табе не праслухаць Ташу? Мяркую, яна добра ўпісалася б у твой калектыў! Табе ж якраз не хапае некалькіх дзяўчат? Таша, як вам прапанова? Вашы музычныя даныя ідэальныя! Зрабілі б вам працоўную візу ў Нямеччыну, мову вы ведаеце, плацілі б добрую стыпендыю, на дачку таксама нейкія грошы былі б — яе можна ўзяць з сабой! Ірэна — кіраўнік хору пры кансерваторыі ў Берліне, яны ездзяць на гастролі па ўсім свеце...

— Артур, твая рэкамендацыя — палова справы! Мы з Ташай сустрэнемся да канца тыдня, і там вырашыцца. Пазваніце мне заўтра раніцай, Таша!

МНЕ падалося, што ўсё адбываецца не са мной — з нейкім маім двайніком, нейкай іншай Ташай з альтэрнатыўнай рэальнасці. Частка мяне быццам аддзялілася, узнялася нада мною і адтуль за ўсім назірала. Яна пабачыла, як Ірэна дастала візітоўку і, трымаючы яе ў тонкіх доўгіх пальцах з чырвонымі прадаўгаватымі пазногцямі і тонкімі залатымі пярсцёнкамі, працягнула Ташы. Таша ўзяла яе і, ледзь зірнуўшы, схавала ў рыдыкюльчык...

Упершыню тым вечарам я не спяшалася. Я ведала: малую пакормяць і ўкладуць спаць, з ёю ўсё будзе добра. Ідучы праспектам без аніякіх планаў, я дыхала марозным паветрам і не адчувала холаду. Глядзела на рознакаляровыя агні горада, міма праплывалі вясёлыя галасы маладых людзей, што жартавалі і смяяліся... І на душы было светла.

З Ірэнай мы сустрэліся ў яе на кватэры. Спачатку я вельмі хвалявалася. Але потым зразумела: дарэмна. Што я страчу, калі ёй не спадабаецца мой вакал?

Але ёй усё спадабалася. Яна дала мне спіс дакументаў, што я мусіла як найхутчэй падрыхтаваць, запісала мае пашпартныя звесткі, і мы развіталіся.

У думках я ўжо бачыла сябе на сцэнах Берліна. Глядзела на родны горад як у апошні раз. І раптам неймаверная, тупая, гнятлівая пустэча запаланіла ўсю маю душу... Навошта мне тыя сцэны, калі сярод гледачоў не будзе Артура?

...Я патэлефанавала Ірэне і ветліва адмовілася ад яе прапановы.

## ООО «Центр Белинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

**Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (складское помещение) с инв. №350/D-271000, площадью 207,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Севастопольская, 143А-6. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006226 площадью 0,2249 га (доля в праве аренды – 17/20). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами. | **54 043,00 руб.** | **5 404,30 руб.** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 28 августа 2017 г.** в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **30 августа 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС- Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 29.07.2017 г. |
| Условия продажи | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 5 (пять) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**



## Силы природы на защите всей семьи: натуральные зубные пасты R.O.C.S.® Bionica




Экотренд продолжает набирать обороты, привнося в нашу жизнь новые «зеленые» привычки и экологичные товары. Обратившись к вековому опыту использования природных компонентов в профилактике заболеваний полости рта, R.O.C.S.® представляет новую серию средств R.O.C.S® Bionica.

### 5 «ЗА» В ПОЛЬЗУ ПРИРОДЫ:

**1.** Натуральная зубная паста для всей семьи **R.O.C.S.® Bionica для здоровья десен** на 99% состоит из компонентов натурального происхождения, а большая часть ингредиентов входит в пищевой рацион человека.

**2.** Идеально подходит людям, страдающим повышенной чувствительностью зубов, кровоточивостью и воспалением десен.

**3.** В состав пасты включены активные фракции солодки, чабреца и ламинарии, известные своими целебными свойствами.

**4.** Минеральные соли в сочетании с глицерофосфатом кальция защищают зубы от кариеса и активируют обменные процессы в пародонте.

**5.** Может быть рекомендована к применению беременным женщинам и детям до 6 лет, так как не содержит фтора, лаурилсульфата натрия, красителей, спирта, абиотических антисептиков и консервантов, в том числе парабенов.

Линейка зубных паст **R.O.C.S.® Bionica** представлена тремя продуктами, учитывающими потребности всех членов семьи:

- R.O.C.S.® Bionica Для здоровья десен
- R.O.C.S.® Bionica Отбеливающая
- R.O.C.S.® Bionica Для чувствительных зубов и десен

УНП 191852370



ОСТРОВ ЧИСТОТЫ

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ТВОЯ ФАНТАСТИЧЕСКАЯ УДАЧА!»

**1 Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (Далее — Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №590828925.

Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, аг. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

**«Твоя Фантастическая удача!»**.

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

01.08.2017 г. — 06.11.2017 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», руководитель отдела маркетинга.

Члены комиссии:

1. Самусев Артём Сергеевич, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по маркетингу.
2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.
3. Короткевич Анастасия Евгеньевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», юрисконсульт.
4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Fa», реализуемой в дискаунтерах «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 1 августа 2017 года по 15 сентября 2017 года включительно:

1. Совершить покупку продукции торговой марки «Fa» на сумму 5 рублей и более в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
2. Получить у кассира магазина анкету участника и заполнить ее, указав:
   - фамилию, имя, отчество;
   - возраст (полных лет);
   - город;
   - телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
   - почтовый адрес, индекс;
3. Приложить копию чека к анкете.
4. Вернуть заполненную анкету кассиру магазина.

К участию в Розыгрыше не допускаются лица, не указавшие свои ФИО, возраст, город, телефон для связи с указанием кодов, почтовый адрес и индекс и не приложившие копию чека.

Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

Участнику необходимо сохранить оригинал кассового чека вплоть до окончания рекламной игры.

Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, отсутствие копии чека, которая должна быть приложена к анкете, или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете с высланной копией чека.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз, каждый раз заполняя анкету участника.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 57 492,66 (Пятьдесят семь тысяч четыреста девяносто два рубля, 66 копеек) с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Посудомоечная машина EXITEQ EXDW-T502 | 20 | 419,1 | 8382,00 |
| | и денежное вознаграждение | 20 | 46,04 | 920,8 |
| 2 | Портативный компьютер ASUS AU K401U 6200U/5AG5/4G/RU// K401 UB-2AFR/WOC/V/WC4/DS | 10 | 1236,0 | 12 360,00 |
| | и денежное вознаграждение | 10 | 168,1 | 1681,0 |
| 3 | Микроволновая печь SAMSUNG ME83KRS-2/BW | 20 | 205,06 | 4101,12 |
| | и денежное вознаграждение | 20 | 14,05 | 281,0 |
| 4 | Автоматическая плойка Rowenta CF3611D0 | 20 | 200,0 | 4000,08 |
| | и денежное вознаграждение | 20 | 13,3 | 266,0 |
| 5 | Автомобиль VOLKSWAGEN POLO<br>Объем двигателя 1598<br>Цвет: Серебристый<br>Куз. №XW8ZZZ61ZJG000994<br>Год выпуска: 2017<br>Странна ввоза: РФ | 1 | 22 200,0 | 22 200,00 |
| | и денежное вознаграждение | 1 | 3300,66 | 3300,66 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 21 сентября 2017 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 15, комната переговоров.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используется лототрон и анкеты участников.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышных анкет получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из лототрона.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы, будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 29 сентября 2017 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и оригинала кассового чека на покупку товаров, по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, со 2 октября по 6 ноября 2017 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.

Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза), победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 02.10.2017 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство №3057 о государственной регистрации рекламной игры «Твоя Фантастическая удача», зарегистрированная 21 июля 2017 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

БПС-СБЕРБАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 июля 2017 года

Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 76 757 | 67 389 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 7359 | 8969 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 204 551 | 287 673 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 287 658 | 139 024 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 907 967 | 1 061 666 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 810 831 | 3 184 782 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 | 589 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 10 045 | 9 691 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 238 973 | 230 858 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 12 505 | 13 234 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 42 982 | 49 459 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **4 599 629** | **5 053 334** |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 514 | 604 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 1 737 090 | 1 968 678 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 2 189 028 | 2 482 292 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 114 696 | 121 844 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 13 172 | 1 610 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 34 495 | 24 565 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **4 088 995** | **4 599 593** |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 73 585 | 73 585 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 25 328 | 24 867 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 33 938 | 34 201 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 377 783 | 321 088 |
| 30 | Всего собственный капитал | 121 | | 510 634 | 453 741 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **4 599 629** | **5 053 334** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## на 1 июля 2017 года

Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2017 | 01.07.2016 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 154 388 | 237 176 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 516 23 | 126 258 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 102 765 | 110 918 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 67 238 | 78 258 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 19 659 | 21 436 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 47 579 | 56 822 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 1568 | (6443) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (117) | (384) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 36 233 | 17 935 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (21419) | 4820 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 19 603 | 92 342 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 97 66 | 12 343 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 80 561 | 84 942 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 9 586 | 10 114 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 66 625 | 8 613 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 9 688 | 48 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 56 937 | 8 565 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | | |

Заместитель Председателя Правления А. В. Борисевич

Главный бухгалтер Н. Н. Ильюкевич

Лицензия Национального банка Республики Беларусь №14 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673
ОАО «БПС-Сбербанк»

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 29 августа 2017 года торгов с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «122 Управление начальника работ механизации»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики продаваемого имущества)** | «М 1/КП Здание склада агрегатов и резины» общей площадью 947 кв. м, (инв. номер в ЕГРНИ: 500/С-27815; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) |
| **Местонахождение предмета торгов** | г. Минск, ул. Уручская, д. 23, корп. 4 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,2651 га, кадастровый номер – 500000000009006271, назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения |
| **Сведения о продавце** | ОАО «122 УНРМ», ул. Уручская, 23, к. 301, 220125, г.Минск, телефон (017) 266-58-02 |
| **Сведения об организаторе торгов** | государственное предприятие «МГЦН», ул. К.Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС, бел. руб.** | 516 848,15 |
| **Размер задатка, бел. руб.** | 51 600,00 |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Приобретенное имущество используется покупателем по назначению в его текущем состоянии без права реконструкции и возведения новых капитальных строений |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «122 УНРМ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Такія дажджы здараюцца тут і там, прычым часта ў месцах, якія знаходзяцца за сотні кіламетраў ад марскога ўзбярэжжа. Дажджы з медуз былі зафіксаваныя ў Токіа, Пекіне, Іркуцкай вобласці і штаце Тэхас ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

# ААТ «БАБУШКІНА КРЫНКА» — кіруючая кампанія холдынга «Магілёўская малочная кампанія «Бабушкіна крынка»

212013, г. Магілёў,
вул. Ак. Паўлава, 3.
Тэл.: 8 (0222) 79-20-10,
тэл./факс:
8 (0222) 79-20-00

## «БАБУШКІНА КРЫНКА» Ў АСОБАХ

Вопытныя работнікі і маладыя спецыялісты, інжынеры і рабочыя — асноўны капітал кампаніі, усе тыя, без каго поспех «Бабушкінай крынкі» быў бы немагчымы. Людзі, якія штодзённай працай пацвярджаюць: захаванне добрых традыцый — залог працвітання.



Якубоўская Надзея Васілеўна — варшчык марожанага. Аношэнка Людміла Мікалаеўна — фрэзероўшчык.



Філатаў Ігар Генадзевіч — слесар па рамонце аўтамабіляў. Курачкін Васіль Васілевіч — намеснік начальніка транспартнага цэха.



Балашэнка Анатоль Фёдаравіч — апаратчык кіравання ЦСМП. Беласаў Васіль Іванавіч — апаратчык сухіх малочных прадуктаў ЦСМП.



Шатова Зінаіда Фёдараўна — прыбіральшчык памяшканняў. Маісеева Алена Анатолеўна — машыніст па мыцці спецадзення. Галяшова Алена Аляксандраўна — прыбіральшчык памяшканняў. Лахадыр Зінаіда Мікалаеўна — прыбіральшчык памяшканняў.



Сівакова Ніна Мікалаеўна — начальнік цэху цэльнамалочнай прадукцыі.



Кузьмянкоў Усевалад Віталевіч — начальнік маслацэха. Кавалёў Яўген Мікалаевіч — старшы майстар прыёмна-апаратнага ўчастка.



Дуброўская Таісія Канстанцінаўна — спецыяліст па нарміраванні і каштоўных паперах. Грачышнікава Ірына Аляксандраўна — эканаміст па вытворчасці 1 катэгорыі. Міхайлава Ала Фёдараўна — начальнік ПЭА. Стрыжанава Таццяна Уладзіміраўна — начальнік АПіЗ. Малашкова Юлія Славенцьеўна, вядучы эканаміст па цэнах.



Калектыў мастацкай самадзейнасці, ансамбль «Крыначка».



Работнікі сталовай, загадчыца — Паддубская Таццяна Адольфаўна.



Шышкіна Наталля Алегаўна, эканаміст АМТЗ. Кавалёў Аляксандр Аляксандравіч, кіроўца. Мельнікава Іна Мікалаеўна, кантралёр гатовай прадукцыі цэха разліву.

УНП 700012278

■ Нататкі адпускніка

# БЯРЫ БОЛЬШ, КІДАЙ ДАЛЕЙ,

## ці Што вы ведалі пра катоў-прарабаў

**Як я люблю казаць, адпачынак — гэта цяжкая праца. Бывае, што часта — у прамым сэнсе слоў. Вырываешся з горада, уражанняў, фактуры — вышэй галавы! І ў галаве пішаш, пішаш... Але то адно трэба зрабіць, то другое. І часу сесці, каб надрукаваць усё, няма. Гэтым разам пашчасціла: атрымалася «ўварваць» гадзіну-другую і прысесці за камп'ютар...**



Дажджы ідуць амаль штодня, затое паліваць агарод не трэба.

### ВОСЬ ТАКІ «КРУТЫ ЗАМЕС»...

...Чатыры вядры шчэбню, тры — гравію, вядро цэменту, амаль вядро вады (тут галоўнае — каб не паўнюткае, мінус тры конаўкі, інакш раствор будзе вадкі). Што робіць бетонамяшалка? Тое, што ёй і належыць — перамешвае. Гр-гр-гр-гр... Гэта пайшлі першыя два вядры шчэбню. Гш-гш-гш-гш... Гэта гравій — таксама два вядры. Паслядоўнасць — абавязковая, інакш сумесь не перамешваецца, а зліпаецца на дне, як той першы блін на патэльні ў некаторых. Шчэбень моцна грукоча, але робіць сваю справу адмысловага дзеркача. Шы-шы-шы-шы... Гэта пайшоў цэмент і вада. Астатнія два вядры шчэбню плюс яшчэ адно гравію танальнасць гуку ўжо істотна не змяняюць. Думаеце, у гэты момант, калі ўсё закінута, вы адпачываеце? Тыя самыя вёдры трэба напоўніць, набраць вады, прынесці і распакаваць цэмент. Шчэбень спецыяльны, будаўнічы, даволі буйны, шуфлем бярэцца цяжка. З гравіем крыху лягчэй, але, калі цягаеш яго цягам усяго дня, ён адчувальна «адрывае» рукі. Цэмент, 25-кілаграмовыя мяхі, таксама трэба прынесці з хлява. Узрываеш рукамі. Здавалася б, папяровая ўпакоўка... А паспрабуйце самі... І калі ты гэта ўсё зрабіў, замес ужо гатовы. Нахіл, гатовы раствор вывальваецца ў тачку ці спецыяльную будаўнічую ёмістасць (у залежнасці, куды падаваць патрэбнае). Гр-гр-гр-гр... Гш-гш-гш-гш... Шы-шы-шы-шы... Ну, вы зразумелі алгарытм, так? Пакуль усё каўбасіцца (таксама памятаеце?): шчэбень, гравій, цэмент, вада... Ты адпачываеш не калі хочаш, а калі рухавік у бетонамяшалкі награецца і яму трэба астыць хоць бы хвілін 15—20. Тады можна і курнуць. А яшчэ — шчэбень, гравій, цэмент з хлява, вада з чана...

### ФАНТОМЫ Ў СНЕ І ЖЫЦЦІ

...Калі легчы спаць і не рухацца (а пасля такой работы цела ўдзячнае за любое адносна гарызантальнае становішча), табе як быццам бы нічога і не баліць. Яшчэ лепш не гаварыць і нават не ўсміхацца, бо гэта таксама балюча, як высветлілася. Галоўнае, паўтараю, не рухацца. Адзінае — рукі. Нават у сне ты адчуваеш фантомную гумку ад пальчатак на запясці, самі пальчаткі, якія даўно зняў, кожную дзірачку на кожным пальчатачным пальчыку, пах і смак у роце цэменту.

...Калі я раз-пораз мімаходзь згадваю пра такую работу, у большасці выпадкаў чую адно: дык наймі каго! Каго? Адзін сусед у выхадныя дні рамантаваў машыну, другі — займаецца заменай акна на гарышчы. Трэці — мае час на агарод толькі ў выхадныя... Сябра дзяцінства, Жэка, майструе маці металічную агароджу... Да таго ж лепш, чым сам для сябе, табе ніхто не зробіць. Аднак жа... Падумалі мы з братам і вырашылі наняць для ўзвядзення сцен з блокаў двух памочнікаў: інакш увесь водпуск (ну, вы ж ведаеце, гэта тыя дні, якія ты выдаткоўваеш для будоўлі) пайшоў бы на тое.

...Ад дзесяці тон шчэбню засталася ў лепшым выпадку пятая частка. Ад такой жа колькасці гравію — прыкладна столькі ж. Таму днямі ў наш палісаднік (бывайце, жончыны кветкі...) зноў здаваў заднім ходам МАЗ з гравіем. Шэсць кубоў, чарговыя дзесяць тон. Ад болын чым паўтары тоны цэменту засталося кілаграмаў сто (насамрэч кілаграмаў гэты будаўнічы расходнік ніхто не вымярае, проста слова «тона» паўтараецца ў тэксце). Давядзецца браць яшчэ прыкладна столькі ж...

А што было дагэтуль? Траншэі пад апалубку для фундамента, яе ўстаноўка (пра параметры скажу толькі адно: вайскоўцы так ДОТЫ будуюць), уладкаванне і вязка арматуры. Ну, а потым... Чатыры вядры шчэбню, тры — гравію, вядро цэменту, вядро вады — без трох конавак, усе памятаюць? Гр-гш-шы... Замес гатовы, закладай новы...

### ТЭХНАЛОГІІ СУПРАЦЬ КАВАНЫХ ЦВІКОЎ

Вы ўжо здагадаліся, што мы будуем? Цёплую веранду. Матуля старэнькая, патрэбная цёплая падлога, гарачая вада, пральная машына, адпаведна, каналізацыя, душавая, бойлер... Карацей, вы ўжо чакаеце «Нататкі адпускніка — 3»?

Скажу шчыра, што за старую драўляную веранду заўсёды крыху хваляваўся. Як моцны вецер, падавалася, што дах можа знесці. Пагледзіш на фундамент, думаецца, нагой добра пхні — пасыплецца. А як пачалі разбіраць... Ведаеце, не ўпэўнены, што цяпер так будуюць, як зрабіў некалі практычна ў адзіночку нябожчык-бацька. І гэта без сучасных электраінструментаў, усё — уручную. На цвік, а не на шруб, без розных будаўнічых пісталетаў, прыцірак, замазак... З дахам, здымаючы яго, намучыліся: насамрэч ніякі ўраган быў бы не страшны. Фундамент стары лупілі па чарзе ўтрох кувалдамі. І той, якая важыць чатыры кілаграмы, і той, што важыць восем. А вам даводзілася? Гэта калі ты з усёй моцы матузіш хвіліны тры, а потым дыхалку аднаўляеш пяць хвілін. Спартсмены тут адпачываюць: у будоўлі не столькі сіла патрэбная, колькі навыкі. Іскры навокал ляцелі, як падчас гарадскога свята, каменная сечка біла, як шрапнель, і па ахоўных акулярах і метраў на сем навокал. Каб не яны, акуляры, без зроку можна было б застацца. Брат спецыяльны перфаратар набыў загадзя для гэтай аперацыі, каб задачу з фундаментам старым аблегчыць. Ведаеце, што тая машынка нам сказала? Дры-ы-ы-ы... Ну, гэта я сваімі словамі. І лепш кувалды нічога не было.

А што да каваных цвікоў... Падчас разбору старой канструкцыі знайшлі некалькі такіх розных памераў. Мяркую, ім гадоў каля ста. Ведаеце, іх хоць зараз у справу пускай. А сучасныя «вадкія цвікі», цікава, колькі праслужаць?..

### АГУРКІ «СТРОГАГА РЭЖЫМУ»

Ну, як у водпуску без агарода? Але ж сёлета самі бачыце, якое надвор'е?.. Калі летась ужо ў пачатку ліпеня балавалі сябе кампоцікамі са свежых ягад, дык зараз толькі назіраем, як тыя, нешматлікія, толькі пачынаюць налівацца... Тры гады таму, прыгадваю, незапланавана паехалі ў сталіцу: адбівалі ледзьве не ў прамым сэнсе слоў у шпакоў вішню, таму давялося везці яе ў замарозку. Якая сёлета вішня? Затое і шпакоў няма. Тая, скажу я вам, яшчэ навала...

Паліваць агарод не трэба. Ды там і не расце нічога, так, сядзяць сабе насельнікі дзёўбам. Можа, і да лепшага, што сёлета мінімум палову ўчастка занялі будматэрыялы? Навошта і астатняе засаджвалі, за расаду перажывалі? Слухайце, а як вам ідэя з газонам? Ну, пасля будоўлі, агарод жа ўсё роўна «ўбіты», «пахаваць» працсей, чым рэаніміраваць...

Жартую крыху, канешне, але ў градкі давялося вылезці. Як па мне, дык працсей блокі цягаць, раствор замешваць, бо рукі і спіна баляць потым аднолькава. А для хлопчыка «цягаць блокі» гучыць неяк больш ганарліва, чым «я ўмею палоць», так? Я ўмею, толькі вы пра гэта не чулі, дамовіліся?

Паколькі на ўчастку былі складзіраваныя будматэрыялы (дошкі, блокі, лагі), а колькі градак усё ж было, брат вырашыў расаду агуркоў «абгарнуць» у рэштki будаўнічай металічнай сеткі. Ну, каб не «пашкрабаць» іх, пераносячы арматуру ці дошкі. Дарэчы, калі я спрабаваў у адзіночку выцягнуць і перанесці шасціметровай даўжыні арматурыну, некалькі агуркоў «ахова» насамрэч выратавала: толькі крыху пагнулася. Дык вось цяпер тыя расліны ў металічнай сетцы я называю агуркамі «строгага рэжыму». А што, якое лета, такая і агародніна, такія і назвы... Можна падумаць, некаму лягчэй. Гэта я пра сябе.



Падчас разбору старой канструкцыі знайшлі некалькі каваных цвікоў. Іх хоць зараз у справу пускай.

### «ХВАСТАТЫЯ ЎЗРОЎНІ»

...Ну і як жа без катоў? Вось і зараз, пакуль дайшоў да камп'ютара пасля невялікага перапынку, двойчы ледзьве не паваліўся: літаральна кідаюцца пад ногі. Хоць і характар у іх розны, але па сутнасці ўсе жывёлы ў нас (а катоў было ўжо пяць) — пацанскія. Што б ты ні рабіў — сек дровы, капаў нешта, прыбіраўся на двары — яны заўсёды будуць побач, цікуюць, уважліва за табой назіраюць, правяраюць. Асабліва «малодшы» (яму яшчэ года няма, у лістападзе падкідыша на далоні ў хату прынёс).

...Вывелі сцены амаль што да верху. Ранкам выходжу пакурыць на двор. «Малодшы» па алычы заскоквае на кладку, дэманструючы гаспадарам свае вышынна-хуткасныя якасці. Чатыры разы на маіх вачах павольна абышоў па перыметры пабудову, затрымаўся на вуглах, нават пасядзеў на кожным, уважліва пагледзеў уніз, направа-налева, «зверыў» вуглы, потым палез правяраць, як будучы дах веранды будзе стыкавацца з агульным — лапку прасунуў, памацаў, нешта там выгарнуў. Зноў вярнуўся на вугал і правярае, не горш за той электронны ўзровень. І — не хоча сыходзіць! Бачна, што работу «прыняў», яму спадабалася. Там зверху, дзе павінен ляжаць арміруючы пояс, у блоках пад заліўку прапіленыя пазы. Ну дык «малодшы» туды і заваліўся. Мне надакучыла назіраць, пайшоў у дом. Праз пару гадзін выходжу зноў пакурыць, а са спіны — храп! Гляджу — «дробны» з таго самага паза зверху сцяны высоўваецца. Там і спаў увесь час. Значыць, спадабалася. А ката ж запускаюць у дом першым. Ну, то і мы будзем спадзявацца, што намаганні не марныя.

***P.S.*** *А што мне яшчэ сніцца? Ну, прынамсі, у першыя дні пасля работы. Ранішнія рэдакцыйныя планёркі. «А што ў вас цікавага ў нумар будзе?» Ну вось, атрымайце, спадзяюся, што не вельмі сумна... Але часта пісаць не абяцаю. Толькі калі бетонамяшалка адпусціць...*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*
**Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ**



«Хвастаты ўзровень» работу «прыняў», яму спадабалася...

Суботнік з Вожыкам

## Дыялогі

### ДАЖЫЦЬ ДА СТА ГАДОЎ

— Дзеду! Скажы, а як ты дажыў ажно да ста гадоў? — пытаецца маленькі Косцік.

— Усё дзякуючы таму, унучак, што нарадзіўся я ў 1917 годзе, — растлумачыў дзед.

### СЦІПЛЫ ТАТА

— Мама, а тата быў сціплым чалавекам?

— Вядома, бо інакш табе было б на пяць гадоў болей.

### АКУЛЯРЫ

Сустрэліся дзве сяброўкі.

— Вой, і ты ўжо носіш акуляры?! — здзівілася першая і з'едліва дадала: — Ну, затое так твае маршчыны будуць незаўважнымі.

— І праўда! Да таго ж твае маршчыны стануць больш выразнымі, — не разгубілася другая.

### КУПІЎ ТАКСУ

— Навошта ты купіў таксу? — пытае сусед суседа.

— Ды каб усе мае дзеці маглі адначасова яе гладзіць!

**Даслаў Леў КАЗЛОЎ,**
*г. Мінск.*

## МАЛАДЗІЛЬНЫ ВЯНОК

*Пародыя*

*Ты мне здаешся*
*школьніцай-дзяўчынкай*
*У тым вянку рамонкавым сваім...*
* * *
*А можа, й мне узяць*
*памаладзець...*

**Мікола ШАБОВІЧ**

Гады ляцяць.
Даводзіцца пацець,
Калі ўверх па лесвіцы
намецішся
А ты ў вянку рамонкавым
аж свецішся...
Дык можа,
й мне узяць памаладзець?
І вось аднойчы, лета як гуло,
Натрапіў на паляну
я з рамонкамі
І, прыгадаўшы
вусны твае тонкія,
Вянок сабе ўздзябурыў на чало.
Не ведаю, ці шмат памаладзеў,
Ды, як вяртаўся
вуліцай вясковаю,
Дзядыківалі здзіўлена галовамі,
А дзеўкі пахаваліся за хлеў!

**Аляксандр БЫКАЎ.**
*г. Мядзел.*

## ДУМКІ ЎГОЛАС

Беднасць — не загана, загана — нежаданне ад яе пазбавіцца.

Экзамены могуць быць на носе, але веды — толькі ў галаве.

Калі цябе хваліць дурань, гэта яшчэ не значыць, што ты вельмі разумны.

**Даслаў Барыс КАВАЛЕРЧЫК,**
*г. Гомель.*




## Афарызмы

Старых п'яніц сустракаеш часцей, чым старых дактароў.
*Франсуа Рабле, французскі сатырык.*

Адна з самых распаўсюджаных хвароб — ставіць сабе дыягназ.
*Карл Краус, аўстрыйскі пісьменнік.*

Рэпутацыю доктара ствараюць знакамітасці, якія памерлі пад яго назіраннем.
*Бернард Шоу, англійскі драматург і дзяржаўны дзеяч.*

Сексуальная рэвалюцыя завяршылася поўнай перамогай вірусаў.
*Патрык А'Рурк, амерыканскі пісьменнік і гумарыст.*

У магутнасць дактароў вераць толькі здаровыя.
*Альфрэд Конар, польскі белетрыст.*

## РЭКОРД

*Пародыя*

*...Каб ты стварыў мне лёгкі грэх.*

**Тамара МАЗУР**

Быццам спеленькі арэх,
Прыняла я лёгкі грэх.
Быў душы маёй бліжэйшы
Грэх у два разы цяжэйшы.
Фінішам былых гадоў
Стаўся грэх у сем пудоў.
Заўтра я без абароны
Грэх прыму вагой паўтоны.
Уцягнулася, бы ў спорт,
І іду я на рэкорд!

**Пётр СЯМІНСКІ,**
*г. Гродна.*

## ВАРОНА І ЛІСА

*Байка*

Варона раз купіла ў магазіне
На зніжках сыр — па выгаднай цане.
Уселася паснедаць на хваіне,
А можа быць, дарэчы, на сасне.
Ліса там, як на ліха, прабягала,
Уверх сястрыца вочы падняла,
Убачыўшы Варону, запытала:
— За колькі сыр, сяброўка, узяла? —
Ды трук Варона хутка раскусіла.
Напэўна б пахваліў яе Крылоў,
Бо яго байкі ведала, любіла.
Схавала сыр пад левае крыло
І кошт ласунку гэтага назвала.
Ліса такой падставы не чакала.
— Заўмаг Барсук сказаў сакрэтна мне,
Што хутка сыр падымецца ў цане.
Разы ў тры, а можа, нават болей.
— Ды ну?! Цяпер не буду есці ўволю! —
Аж скокнула ад роспачы Варона.
Сыр выпаў. І хто з'еў яго — вядома.

**Уладзімір ГРЫШЧАНКА,**
*г. Гомель.*

## Мініяцюры

Мо тыя дзяўчаты купаюцца ў шчасці,
Якія жывуць ля вайсковае часці?..
* * *
Быў кавалерам хоць актыўным,
Але, на жаль, неперспектыўным.
* * *
Усякую красуню-прыму
Разгледзець хочацца без грыму.
* * *
Начальнік, падкраўшыся ўпотай,
Застукаў мяне... за работай.
* * *
Ці дараваць мне, рашаеш сама ты,
Нават тады, калі невінаваты.

**Алесь КОРНЕЎ,**
*г. Баранавічы.*

## Анекдоты

Сябры вяртаюцца з вечарынкі.

— Глядзі, — кажа адзін, — а месячык квадратны!

— Ты моцна напіўся, ён — трыкутны, — пярэчыць другі.

— Не спрачайцеся, — супакойвае іх трэці сябар. — Вы абодва кажаце праўду: адзін месячык квадратны, а другі — трыкутны.

* * *

На пікніку:

— Глядзі, дарагая, трава зусім не сырая. Проста ты села на бульбяны салат пад маянэзам...

* * *

— Наш дзядуля не вельмі разззлаваўся, калі яго правяралі на мытні?

— Наадварот! Бо калі яго правяралі, то знайшліся ягоныя акуляры, якія ён згубіў тыдзень таму.

**Пераклад з чэшскай Міхася СЛІВЫ.**

## Вуснамі дзяцей

### ПАЖАРУ НЯМА

Бабуля загаварылася з чатырохгадовым унукам Арцёмкам ды зусім забылася, што на пліце смажыцца бульба.

— Вой, мая бульба гарыць! — залямантавала жанчына і пабегла на кухню. За ёй паспяшаўся і Арцёмка. Ён агледзеў усё навакол і спытаў:

— Чаго ты, бабуля, так усхвалявалася? Ніякага ж пажару няма!

**Даслала Валянціна ХАЛЕЦКАЯ,**
*г. Гомель.*

### НЕ ЎКЛЮЧАЙ

— Дзядуля, а можна мне паглядзець тэлевізар? — пытаецца маленькі Юрасік.

— Вядома! — адказвае дзед. — Толькі не ўключай яго...

**Даслаў Міхал ШУЛЬГА,**
*Буда-Кашалёўскі раён,*
*г. п. Уваравічы.*

### ІСТОТНАЕ АДРОЗНЕННЕ

Суседзі пытаюцца ў чатырохгадовай Алесі:

— Як ты адрозніваеш сваіх братоў-блізнят?

— Вельмі проста, — адказвае малая. — Аднаго завуць Макар, а другога — Данік!

**Даслаў Міхась СЛІВА,**
*г. Рагачоў.*

## Фота слова





На лугах, якія ў вясновы час шчодра залівае Арэса, у ліпеньскія дні стракацяць краскі, гняздуюцца птушкі, шапочуць травы. Падаецца, што адвечны рух прыроды і маляўнічае раздолле надзяляюць гэтыя травы надзвычайнай жыццёвай энергіяй.

Менавіта так вырашыце вы, калі пакаштуеце духмяную гарбату, завараную на любанскіх травах. Зразумела, што лепш за ўсіх такі напой гатуюць мясцовыя гаспадыні. Вам спатрэбіцца ўнікальны рэцэпт гарбаты — ім валодае народны майстар Беларусі Ірына Яскевіч з вёскі Камуна. Яна ведае безліч мясцовых зёлак.

*Водар любанскіх траў — жыццядайны напой.*
*Кліча ў далеч лугоў сцежка шчаснага лёсу.*
*Я іду, і нястомна вандруюць са мной*
*Аблачынкі-блізняткі па рацэ і ў нябёсах.*

*Лугавыя рамонкі пяшчотна крану,*
*Загляджуся ў блакіт на люстэрку Арэсы —*
*Я вітаю вас, любыя сэрцу майму,*
*Павянчаныя з небам абшары Палесся.*

*Прыйдзе час — і зіма замяце ўсе шляхі.*
*Вось тады я травінку ў далонях сагрэю —*
*Нагадаю пра луг ля Арэсы ракі,*
*І адступяцца, знікнуць ліхія завеі.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## ■ Фестывалім

# АЙДА НА БАРД-РЫБАЛКУ

**З пятніцы і па панядзелак на Чыгірынскім вадасховішчы ў Быхаўскім раёне на радасць усім тым, хто любіць здаровы адпачынак на прыродзе, песні ля кастра і лёгкі пар бадзёрай лазні, пануе творчая атмасфера «Вялікай бард-рыбалкі».**



У праграме восьмага фестывальнага сезона рыбалоўныя спаборніцтвы, конкурс аўтарскай песні, лазнева-аздараўленчыя мерапрыемствы, свята кулінарыі «Кірмаш смаку», прыгатаванне і дэгустацыя найсмачнейшай фестывальнай юшкі, адкрыты турнір па пляжным валейболе сярод аматараў і прафесіяналаў на прызы кампаніі «Гродфуд», конкурс «Каралева бард-рыбалкі» ад Наталлі Наважылавай на прызы міжнароднай федэрацыі фітнесу, урачыстая закладка сімвалічных валуноў у бард-сцежку і шмат чаго іншага. У свяце бяруць удзел аўтары-выканаўцы і музыканты з 11 краін свету.

— Галоўны акцэнт гэтым разам мы робім на выступленнях нашых юбіляраў Юрыя Рашанцава і Юлія Кіма, — падзяліўся **аўтар ідэі і кіраўнік праекта Сяргей КУЛЯГІН.** — З 24 ліпеня на базе святочнай пляцоўкі працуе маладзёжны аздараўленчы лагер, удзельнікі якога мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з Юліем Кімам і паспяваць разам з ім песні. Вельмі раю нашым гасцям наведаць тэатр песні сям'і з Ерусаліма. Упершыню адбудзецца маштабны беларускамоўны канцэрт «Я нарадзіўся тут!» з удзелам такіх вядомых выканаўцаў, як Зміцер Вайцюшкевіч, Вераніка Круглова, Зміцер Бартосік, Кацярына Ваданосава. Гасцей фестывалю чакаюць новыя праекты і сюрпрызы.

Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Магілёўскі аблвыканкам і Быхаўскі райвыканкам, творчае аб'яднанне «Сваё асяроддзе», прадпрыемства «Магілёўаблтурыст» і грамадскі савет па развіцці аграэкатурызму ў Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
24.07.2017 г.
Сушко С.А.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об эмиссии жилищных облигаций семнадцатого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС»

УНП 101484246

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТАПАС»; сокращенное – ТАА «ТАПАС»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ТАПАС».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 4-й этаж, офис 14, тел./факс: 8 (017) 3028410, сайт: www.taps.by (далее – сайт эмитента).

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 27 июля 2001 г. Регистрационный номер 101484246.

4. Уставный фонд эмитента составляет 342 400,10 белорусского рубля.

5. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк» (зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный № 25; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1086, выданного 8 декабря 1993 г., срок действия не ограничен; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6).

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем:

размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);

публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда») и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии жилищных облигаций семнадцатого выпуска эмитента (далее – Проспект эмиссии), размещается эмитентом на Едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет (бухгалтерскую отчетность) в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем:

размещения на Едином информационном ресурсе;

опубликования в газете «Звязда» либо размещения на сайте эмитента.

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента;

в случае реорганизации – с даты принятия соответствующего решения Общим собранием участников эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение пяти календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает информацию о результатах финансово-хозяйственной деятельности, информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость жилищных облигаций настоящего выпуска, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

8. Общее собрание участников эмитента приняло решение о семнадцатом выпуске жилищных облигаций 13 июня 2017 г., протокол № б/н.

9. Архитектурный проект: «Монолитно-каркасный жилой дом с подземной гараж-стоянкой в районе улиц Могилевской, Уфимской».

Государственная экспертиза проектной документации проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: Заключение государственной экспертизы (положительное) от 11 ноября 2016 г. № 693-15/16.

Эмитент является заказчиком объекта строительства: «Монолитно-каркасный жилой дом с подземной гараж-стоянкой в районе улиц Могилевской, Уфимской» (далее — Жилой дом).

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства Жилого дома, подтверждены:

свидетельством (удостоверением) № 500/1236-1526 от 29 мая 2017 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000004005920;

свидетельством (удостоверением) № 500/1236-1527 от 29 мая 2017 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000004005921.

Нормативная продолжительность строительства Жилого дома – 14,5 месяца, в том числе подготовительный период – 2 месяца.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию Жилого дома – 30 сентября 2018 г.

10. Облигации семнадцатого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 1 056 000 белорусских рублей.

Количество облигаций – 1600 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 660 белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в Жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

11. Выпуск облигаций зарегистрирован регистрирующим органом 24 июля 2017 г. Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3059.

12. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных облигаций без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг», в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа.

13. Размещение облигаций эмитентом осуществляется на неорганизованном рынке путем открытой продажи юридическим и (или) физическим лицам – резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения Облигаций: 21 июля 2017 г.

Дата окончания размещения Облигаций: 31 января 2019 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в Жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством Республики Беларусь;

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели Облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту:

по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

Средства при проведении открытой продажи уплачиваются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет эмитента № BY61BLBB30120101484246001001 в Открытом акционерном обществе «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, БИК BLBBBY2X.

14. Срок обращения Облигаций – 587 календарных дней (с 21 июля 2017 г. по 28 февраля 2019 г.).

15. Дата начала погашения облигаций – 28 февраля 2019 г.

Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 21 февраля 2019 г. В случае если дата формирования реестра выпадает на нерабочий день, формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

Владелец облигаций при погашении (досрочном погашении) облигаций имеет право получить номинальную стоимость облигации, либо жилое помещение в Жилом доме, общая площадь которого соответствует эквиваленту номинальной стоимости, выраженному в квадратных метрах, принадлежащих ему облигаций.

16. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания регистрирующим органом семнадцатого выпуска жилищных облигаций недействительным эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций в месячный срок с даты признания выпуска недействительным и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

17. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно в пункте продажи облигаций, указанном в пункте 13 настоящего документа.

Директор Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» — Н.Н. Требенок

Главный бухгалтер Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» — И.А. Голубь

---

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БелВитунифарм»** (УНП 811001710)

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1 Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-56497, площадь – 24 685,1 кв. м, здание главного производственного корпуса, начальная цена — 419 000,00 рублей.<br>Лот №2 Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-56487, площадь – 873,4 кв. м, здание очистных сооружений, начальная цена — 31 700,00 рублей.<br>Лот №3 Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-56494, площадь – 1059,5 кв. м, здание склада производства, начальная цена — 41 400,00 рублей.<br>Лот №4 Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-56496, площадь – 14,6 кв. м, здание караульного помещения КПП-3, начальная цена — 740,00 рублей.<br>Лот №5 Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-56493, площадь – 8,3 кв. м, караульное помещение, начальная цена — 510,00 рублей |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Местонахождение имущества** | г. Витебск, пр. Фрунзе, 77, корп. 2, г. Витебск, пр. Фрунзе, 77 |
| **Место, дата и время проведения торгов** | 22.08.2017 г. в 15.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1<br>www.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель — Атрахимович Николай Александрович, тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879162 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBANBY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 21.08.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве»возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Плещеницлес», Минская обл., Логойский р-н., г. п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47 | | |
| **Предмет аукциона (Месторасположение:** Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Соколовского, д. 1) | | | |
| **Лот №1** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
| **Контора** | 255,6 кв. м | 611/С-31566 | д. 1 |
| ***Составные части и принадлежности:*** пристройка Б1/к, пристройка-1, подвал (А1/к) | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1673 га**, предоставлен Продавцу на праве аренды до 20.11.2063 г. для обслуживания здания конторы. Ограничения: расположен в водоохранных зонах рек и водоемов (р. Березина), пл. 0,1673 га и в охранных зонах электрич. сетей, пл. 0,0028 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 16 869,13 бел. руб.** (снижена на 65%) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| Бытовые помещения | 114 кв. м | 611/С-31568 | д. 1, корп.12 |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,1092 га, предоставлен Продавцу на праве аренды до 20.11.2063 г. для обслуживания бытовых помещений (для размещения объектов обрабат. промышленности). Ограничения: расположен в водоохранных зонах рек и водоемов (р. Березина), пл. 0,1092 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 4 257,45 бел. руб.** (снижена на 65%) | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи: | **10** рабочих дней после проведения аукциона. | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 01.07.2017 г.** | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. | | | |
| **Аукцион состоится 17.08.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 15.08.2017 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42**. www.cpo.by** Email: auction@cpo.by | | | |

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

**Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ООО «Белдверь»**

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Станок кромкооблицовочный «ProfLine KDF 1650», стоимостью 79 543 белорусских рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «Белдверь» (УНП 390285337) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. 4-я Заслонова, 6-4 |
| **Наличие обременений** | Не обременено |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 21.08.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Кирова, д. 16, каб. 11 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска<br>210001, г. Витебск, ул. Кирова, д. 16.<br>Заведующий сектором — Мухина Наталья Михайловна, тел./факс (80212) 63-64-76, начальник отдела — Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212) 60-84-42 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с №BY38AKBB36429030003282000000, филиал №200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, УНП 300002505, код банка AKBBBY21200, не позднее 11.00 17.08.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь №493-З от 24.10.2016 «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем). |

# «ХАЙ СВЯТА ДРУЖБЫ БУДЗЕ ЛЕПШЫМ СВЯТАМ»

Прысвячаецца Міжнароднаму дню дружбы



**Па гарызанталі: 2.** ... здабыць — брацтва забыць (прык.). **5.** Брат можа не быць другам, але ... — заўсёды брат (прык.). **7.** Падсмажаная лустачка хлеба. **9.** Узоры правільнага і прыгожага пісьма. **10.** «Дабро — адна ў нас ..., // І дружба — болей двух». З верша А. Міцкевіча «Песня філарэтаў». **11.** Мы з табою, як ... з вадою; ты на дно, а я на бераг (прык.). **12.** Прывычка. **13.** «Хай ... дружбы будзе лепшым святам». З верша С. Грахоўскага «Патрэбен чалавеку чалавек». **14.** Каму шанцуе, таму падчас і ... коні пасе (прык.). **15.** Частка зямельных угоддзяў. **18.** Дробныя, іншага колеру плямкі на чым-небудзь. **20.** Звязаны пук жжатых сцёблаў збажыны. **21.** ... пазнаюцца ў бядзе (прык.). **22.** Тое, што і калодзеж. **25.** Знак прыпынку. **26.** Старыя сябры і старое ... лепей усяго (прык.). **27.** Жыццё — ... з вішнямі (англійская прык.). **28.** Народнае эпічнае апавяданне. **29.** Тое, што і процьма. **30.** Пачуццё ўдзячнасці за што-небудзь добрае.

**Па вертыкалі: 1.** Ваенны лётчык. **3.** Сябра за ... не купіш (прык.). **4.** Дзіцятка як ..., як замясіў, так і вырасла (прык.). **5.** У беларускай міфалогіі добры або злы дух, што жыве ў хаце (прык.). **6.** Раздзел кнігі, артыкула. **8.** «Ты, ... дарагая, // Пойдзем паабедаем. // Аднаго мілёнка любім — // Пойдзем пераведаем». Прыпеўка. **9.** Выемка ў якой-небудзь дэталі. **16.** Невялічкі тонкі ланцуг. **17.** Кепскі друг, што цень: у сонечны дзень не адчэпішся, а ў ... не знойдзеш (прык.). **19.** Асоба. **21.** Травяністая расліна, якая сустракаецца на дрэнней пашы, лузе. **22.** Адзінка падліку пісчай паперы. **23.** «Самым шчаслівым смехам смяецца ...» Ж. Батай. **24.** Чалавек без друга, што ... без солі (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**

*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі:** 2. Багацце. 5. Друг. 7. Тост. 9. Пропісь. 10. Мера. 11. Рыбка. 12. Звычка. 13. Свята. 14. Воўк. 15. Клін. 18. Крап. 20. Сноп. 21. Сябры. 22. Студня. 25. Дужка. 26. Віно. 27. Карзіна. 28. Сказ. 29. Цьма. 30. Падзяка.

**Па вертыкалі:** 1. Штурмавік. 3. Грошы. 4. Цеста. 5. Дамавік. 6. Глава. 8. Сяброўка. 9. Паз. 16. Ланцужок. 17. Непагадзь. 19. Персона. 21. Сівец. 22. Стала. 23. Дзіця. 24. Яда.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.18 | 21.13 | 15.55 |
| Віцебск — | 5.02 | 21.08 | 16.06 |
| Магілёў — | 5.08 | 21.03 | 15.55 |
| Гомель — | 5.12 | 20.53 | 15.41 |
| Гродна — | 5.35 | 21.27 | 15.52 |
| Брэст — | 5.42 | 21.21 | 15.39 |

**Месяц**

*Першая квадра 30 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр.* Валянціны, Юліі, Івана, Паўла, Пятра, Фёдара, Якава.
*К.* Марты, Серафіны, Антона, Канстанціна, Олафа.



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 29 ЛІПЕНЯ



**1817** год — нарадзіўся Іван Канстанцінавіч Айвазоўскі (1817—1900), рускі жывапісец-марыніст, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1887). Аўтар каля 6 тысяч карцін, малюнкаў, акварэляў, у тым ліку «Дзявяты вал», «Бура на Паўночным моры», «Сярод хваляў» і інш. Пісаў таксама батальныя кампазіцыі, жанравыя палотны, партрэты. У 1880 г. заснаваў карцінную галерэю ў Феадосіі. У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь захоўваюцца карціны «Пётр І каля Краснай Горкі», «Бура», «Месячны пейзаж» і інш.

**1917** — нарадзіўся Пётр Паўлавіч Нікіфараў (г. Віцебск), Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на 1-м і 2-м Украінскіх франтах, штурман знішчальнага авіяпалка. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі. Здзейсніў 297 баявых вылетаў, правёў 69 паветраных баёў, збіў 20 самалётаў праціўніка. Да 1960 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Памёр у 1971 г.

**1937** год — нарадзіўся Веньямін Антонавіч Буркові (Рэспубліка Комі), цымбаліст, заслужаны артыст Беларусі. З 1952 г. артыст, саліст, канцэртмайстар Дзяржаўнага народнага аркестра Беларусі, з 1974-га — саліст Белдзяржфілармоніі. Для яго выканальніцкай манеры характэрныя віртуозная музыка, тэмперамент, артыстызм. У рэпертуары былі арыгінальныя творы беларускіх кампазітараў, перакладанні п'ес кампазітараў-класікаў. Памёр у 1983 г.

**1942** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР былі заснаваны ордэны Аляксандра Неўскага, Суворава I, II, III ступені, Кутузава I і II ступені.

**1952** год — здзейснены першы беспасадачны рэйс рэактыўнага самалёта праз Ціхі акіян.



**1957** год — нарадзілася Нэлі Уладзіміраўна Кім (Таджыкістан), беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР. У 1992—1995 гг. — дзяржаўны трэнер Беларусі па спартыўнай гімнастыцы сярод жанчын. Чэмпіёнка XXI і XXII Алімпійскіх гульняў.

**1957** год — уступіў у сілу Статут Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі. Створана рашэннем ГА ААН ад 3 снежня 1955 года. Сваю практычную дзейнасць МАГАТЭ пачало 23 кастрычніка 1957 года, калі на яго генеральнай канферэнцыі было зацверджана пагадненне, якое рэгулюе ўзаемаадносіны паміж агенцтвамі і ААН. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (2005 г.).

**1977** год — у Мінску заснаваны Беларускі навукова-даследчы інстытут кардыялогіі. Ён быў арганізаваны на базе Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі кібернетычных метадаў дыягностыкі і біякіравання пры актыўным удзеле прафесара Г. І. Сідарэнкі, які ўзначаліў інстытут і кіраваў яго работай да 1993 года. З 2000 года — РНПЦ «Кардыялогія».

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік:**
*«І ў самай большай пасудзіне на свеце ёсць дно».*

## УСМІХНЕМСЯ

Сядзяць у гарах на выступе два альпіністы, бачаць далёка ўнізе групу, якая павольна падымаецца. Адзін:

— Глядзі, ужо піянерам сталі на гэтую гару вадзіць.

— Гэта не піянеры, а горныя турысты.

— А што ж яны тады ў чырвоных гальштуках?

— А гэта не гальштукі, гэта іх языкі.

**Жонка даведалася пра палюбоўніцу — жах! Землятрус, пагром, лясны пажар! Я думаў, горш у жыцці наўрад ці будзе мне...**
**Але тут палюбоўніца даведалася пра жонку!**

— Для нашай кампаніі вы крыху кансерватыўны. Хоць лапці ў вас прыгожыя!

**У нас дома, калі жонка, сабраўшы на стол, кліча «Ідзіце вячэраць!», чамусьці толькі ката не даводзіцца клікаць двойчы. Хаця яго якраз і не запрашалі.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2771.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2017 года.